Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 4 1933 г. № 121 (4665)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Чыстка партыі пачалася.

Ф. ГЛОБІГ — Пралетарская салідарнасьць на фронце антыфашысцкай барацьбы (2 стар.).

ШЧАДЗІСТАЎ — Тарфянікі, ад вас залежыць пералом у рабоце. (3 стар.).

ПРАВЯРАЦЬ, ЧЫСЬЦІЦЬ ПАРТЫЮ ПАВІННЫ ТОЛЬКІ ЛЕПШЫЯ, АДДАНЫЯ СЫНЫ ПАРТЫІ (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ — Дзьве газэты — два вынікі. (2 стар.).

Аб складзе раённых камісій па чыстцы партыі—Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Антысавецкі выпад германскай паліцыі (4 стар.).

Германія стараецца зьнізіць курс аўстрыйскіх грошай (4 стар.).

Новыя бясчынствы манчжурскіх улад на станцыі Пагранічная (4 стар.).

ЦК УсеКП(б)—тав. СТАЛІНУ, СНК СССР—тав. МОЛАТАВУ, УсеЦСПС—тав. ШВЭРНІКУ, НКФ СССР—тав. ГРЫНЬКО, рэдакцыі газэты „ПРАВДА"

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным, БССР атрымала яшчэ адну перамогу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Плян рэалізацыі пазыкі па гораду выкананы на 102,2 проц., у тым ліку сярод рабочых і служачых на 104,4 проц. і па калгасным сэктары на 100,7 проц. Узоры гераічнай работы па рэалізацыі пазыкі паказалі пралетарскія цэнтры БССР—Менск і Віцебск; раёны: Жыткавіцкі, Дзяржынскі, Заслаўскі, Вузьдзенскі, Старобінскі, Аршанскі, Клімавіцкі, Слуцкі. Пераключаемся на поўны ахоп пазыкай працоўных аднаасобнікаў і замацаваньне дасягнутых посьпехаў па арганізаванаму сэктару.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
ЦСПСБ ЛІСКОВІЧ.
Наркамфін ХАЦКЕВІЧ.

ЧЫСТКА ПАРТЫІ ПАЧАЛАСЯ

У Маскоўскай і Ленінградзкай абласьцях камісіі прыступаюць да чысткі партыйных ячэек. У бліжэйшыя дні пачнецца чыстка ячэек ва Уральскай, Дзічэнскай, Амурскай, Кіеўскай і Вінніцкай абласьцях, далёка Усходнім і Усходня-Сібірскім краёх і ў Беларусі.

Як і трэба было чакаць, чыстка выклікала вялікую зацікаўленасьць гутары краіны і за яе межамі. Замежны—буржуазны і белагвардзейскі—друк «карыстаецца выпадкам», каб жмені раз пазлараслаўца на адрасе Савецкага саюзу, нашай партыі, зноў і зноў прадракаючы ёй... нямінучую гібель. «Чыстка УсеКП(б) выклікана «экстранымі», «асаблівымі» акалічнасьцямі»... УсеКП(б) коціцца ўніз»,—надрываючыся, крычаць зараз белагвардзейскія адшчапенцы. Якое ўсё гэта старое, якое сьмешнае!

Вялікочны ўздым, з якім адказалі партыйныя і беспартыйныя масы на пастанову ЦК і ЦКК аб чыстцы, яшчэ раз сьведчыць аб магутнасьці нашай партыі. **«Партыя ставіць пытаньне аб чыстцы сваіх радоў не таму, што яна слабая, а таму, што яна моцная» (КАГАНОВІЧ).**

Чыстка партыі зьяўляецца вышэйшай формай партыйнай самакрытыкі. Ні адна партыя ў сьвеце ня здольна вытрымаць такой самакрытыкі. Нікай капрабуюць заняцца, скажам, сацыял-фашысцкія партыі адкрытай чысткай сваіх радоў перад тварам мільёнаў пра летараў, якіх гэтыя партыі жорстка ашуквае і эксплюатуюць у інтарэсах буржуазіі, і мы навочна пераканаемся, наколькі пагібельнай для іх выяўляецца падобная самакрытыка. Толькі наша партыя—партыя перамог новага грамадзкага ладу, свабоднага ад эксплюатацыі, ад калёніяльнага рабства і нацыянальнай прыгонасьці,—можа дазволіць сабе такі від самакрытыкі, як адкрытая чыстка.

Перад пачаткам чысткі ячэек разгорнецца шырокая масава-растлумачальная работа і дакладная арганізацыйная падрыхтоўка на мясцох. Пытаньні чысткі грунтоўна прапрацоўваюцца слірод партыйнага актыву, на закрытых партыйных сходах і на сходах ячэек з удзелам пераважнай большасьці беспартыйных рабочых і калгасных мас. Надзвычай паказальны той факт, што абмеркаваньне пастановы ЦК і ЦКК аб чыстцы выклікае павышаную зацікаўленасьць мас да пытаньняў арганізацыйных прынцыпаў бальшавізму, гісторыі партыі, ролі і задач партыі ў другой палове гоцды. Гэта ёсьць ні што іншае, як яркае выяўленьне **перамогі бальшавіцкай партыйнасьці.**

Ідэі бальшавіцкай партыі заваёўваюць новыя і новыя пласты працоўных мас гораду і вёскі. Тым больш недараваньнямі зьяўляецца непаваротлівасьць некаторых партыйных арганізацый у растлумачэньні мас мэт і задач чысткі. Ёсьць ячэйкі, напрыклад, у расе рабаў Уралу (дый ня толькі Уралу), якія сваю растлумачальную работу лічаць выкананай пасьля, скажам, правядзенага адкрытага партыйнага сходу. Вядома, актыўны партыйны сход—адна з лепшых форм пропаганды і растлумачэньня, але абмяжоўвацца гэтым нельга. Трэба забясьпечыць (праз сетку партыйнай асьветы, спэцыяльныя гурткі і асабліва на старонках мясцовага друку) глыбокае ўсьвядамленьне масамі ролі і значэньня чысткі партыі ў цяперашніх умовах, неабходнасьці поўнага ўдзелу ў чыстцы ня радоў, задач цяперашняй чысткі.

Трэба памятаць, што партыя за апошнія гады значна вырасла і што ў сувязі з гэтым вялікарная колькасьць камуністаў будзе ўпершыню праходзіць гэту чыстку.

Сярод некаторых маладых камуністаў, ацаных партыі, німала такіх, якія ня досыць усьвядомілі сабе значэньне чысткі. Трэба растлумачыць такім камуністам значэньне чысткі.

Тысячу раз мае рацыю маладая камуністка, работніца маскоўскай «Трехгорной мануфактуры» Конева: «Чыстка ёсьць справа тонкага, яна дапаможа жыцьць неапаровыя моманты ў рабоце і праверыць кожнага камуніста. Член партыі павінен быць правадыром на сваім участку. Я ўпершыню буду з хваляваньнем, але бяз страху. Хваляваньне таму, што я ганаруся сваім прабываньнем у такой партыі, якою зьяўляецца наша партыя, бяз страху таму, што я сябе лічу годнай быць у яе радох».

Апублікаваня ўчора прамова тав. Кагановіча на Маскоўскім гарадзкім партактыве, якая з вычарпальнай паўнатой абмалёўвае значэньне чысткі партыі, асабліва задач цяперашняй чысткі і яе ролі ў павышэньні ідэалёгічнага ўзроўню партыйных мас, **павінна легчы ў аснову ўсёй нашай растлумачальнай работы па чыстцы. Кожны камуніст павінен самым уважлівым чынам вывучыць гэты важнейшы дакумант і, узброіўшыся ім, несьці бальшавіцкае слова ў гушчу беспартыйных мас.**

Посьпех чысткі ў рашаючай ступені залежыць ад дакладнай арганізацыйнай падрыхтоўкі на мясцох. Галоўнае тут—падбор праверачных камісій, якія павінны правесьці вялікарную і адказнейшую работу. «Наша партыя ачышчае сябе для таго, каб стаць яшчэ больш баяздольнай, каб адтачыць сябе, каб партыйны молат ленін выкоўваў, каб наш апарат ленін працаваў, каб наша гаспадарка ленін разьвівалася, каб кансцыляцыйна і бюракратызм хутчэй зжываліся, каб рабочым масам і сялянству ленін жылося»... **(Каганові́ч).** Камуністы павінны правяць глыбокую дзелавітасьць і настойлівасьць у вывучэньні **характару вытворчасьці і ўмоў,** у якіх працуюць правяраемыя арганізацыі, бо толькі па гэтай аснове камісіі могуць правільна падыйсьці да праверкі **клясавай баяздольнасьці** данай арганізацыі. Разам з тым, камісіі павінны правяць вытрымананасьць, стойкасьць, чуласьць, цярплівасьць і ўменьне не фармальна падыйсьці да справы, а па сутнасьці, бо справа датычыць і арганізацыі ў цэлым, і кожнага камуніста ў паасобку.

Вось чаму **правяраць, чысьціць партыю павінны толькі лепшыя, адданыя сыны партыі.** Уважлівы падыход маскоўскіх і ленінградзкіх абласных і раённых камісій да падбору членаў праверкомаў дае права заявіць, што, напрыклад, **чыстка маскоўскай і ленінградзкай арганізацый знаходзіцца ў моцных, надзейных бальшавіцкіх руках.**

Пакуль яшчэ няма ў нас такой упэўненасьці ў адносінах некаторых іншых арганізацый. Паасобныя райкомы і раённыя КК (на Урале, Далёкім Усходзе), не чакаючы ўказаньняў абласных камісій, насьпех самі падбіраюць і сваёй уладай зацьвярджаюць праверкомы, і рэзультаты ад гэтага атрымліваюцца вельмі сумныя: у камісіі вылучаюцца часамі людзі нявытрыманыя, недысцыплінаваныя (з некалькімі партэпагнаньнямі), нават з падазронай рэпутацыяй (прыклад: Марчэўскі з Вінніцы).

Пры такім падборы праверкомаў чыстка можа ператварыцца дзе-ні-дзе са зброі барацьбы за ўмацаваньне партыі ў зброю барацьбы супроць партыі. Як вобразна сказаў тав. Сталін, чыстка напамінае ўсім, што ёсьць гас падар, які час-ад-часу ідзе па радох партыі з мяталой у руках і вымятае з яе складу ўсё нягодное і непатрэбнае.

Праверкомы, выконваючы волю партыі, закліканы моцна ўзяць у рукі мяталу і прыбіральна скарыстаць яе пры значэньне. Няма сумненьня, што чыстка будзе праходзіць у абставоўцы разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў таварыскай атмасферы.

Камісіі па чыстцы, работа якіх будзе ісьці пад кантролем усёй партыі, абавязаны забясьпечыць дакладную праверку і палепшэньне работы правяраемых партарганізацый, ачысьціць партыйныя рады ад усіх чужых элементаў, якія прымазаліся, дапамагчы перавыхаваньню людзей, злоўных правяраіца і стаць сапраўднымі бальшавікамі.

Бальшавіцкае, удумлівае правядзеньне чысткі—гарантыя таго, што яна яшчэ больш умацуе і згуртуе нашу партыю і мільённыя масы працоўных вакол ленінскага ЦК, вакол забясьпечыўшага нашы перамогі вялікага праводыра партыі і рабочае клясы тав. Сталіна.

(З перадавога артыкулу «Праўды»).

ЗАВЯРШАЮЧЫ СЯЎБУ, УДАРНА РАЗГОРТВАЦЬ ПРАПОЛКУ І УЗДЫМ ПАПАРАУ

„ЦК і СНК папярэджваюць, што канчатковым тэрмінам сяўбы зьяўляецца апошняя пяціднеўка" (З ТЭЛЕГРАМЫ ЦК І СНК АДСТАЮЧЫМ РАЁНАМ)

БЕГ НА МЕСЦЫ

ВІЦЕВСК, 3. (Ад нашага карэспандэнта).

Зноў таптаньне на адным і тым-жа месцы. Па-ранейшаму ганебнае адставаньне. На 31 мая засеяна толькі 18.762 га—62,4 проц. Апошняя пяціднеўка дала вусім мізэрны прырост—усяго 6 проц. Асабліва дрэнна ідзе сяўба па аднаасобных гаспадарках. План выкананы толькі на 38,5 проц.

Аб гэтых лічбах бясспрэчна яшчэ раз скажа сваё слова гарком партыі, зафіксуе іх і гарсавет. Але-ж і ў мінулыя пяціднеўкі гарком партыі ня раз прымаў бясконцыя пастановы аб дрэнным правядзеньні сяўбы.

Аднак, усё той-жа бег на месцы.

Вось перад намі пастановы гаркому партыі ад 28 мая. Гарком асабліва падкрэсьлівае злачыннае адставаньне ў сяўбе па Рудніцкім сельсавеце, дзе ўпаўнаважаным РК КП(б)Б зьяўляецца т. Брыкаў. У пастанове ясна сказана, што Брыкаў і інш. работнікі, як упаўнаважаныя гаркому партыі сябе не апраўдалі.

Здавалася-б, што далей у гэтай-жа пастанове гарком зробіць неабходныя вывады ў адносінах да Брыкава і да яго падобных, тым больш, што Брыкаў зьяўляецца загадчыкам зямельнага аддзелу гарсавету. І аказваецца, што Брыкаў прызначаецца для кіраўніцтва сяўбой у калгас «Шлях да сацыялізму», таго-ж сельсавету. Кашцы в канцамі штосьці ня ўвязаны.

Сапраўдныя прычыны ганебнага адставаньня Віцебшчыны крыюцца ў дрэннай арганізацыі працы, у слабай працоўнай дысцыпліне і ў вельмі дрэнным кіраўніцтве сяўбой на мясцох.

Варта адзначыць, што, напрыклад, у калгасе «Бальшавік», Рудніцкага сельсавету, на полі працуе 20-22 чалавекі. І столькі-ж людзей гуляе, па розных прычынах адвільвае ад работы.

Па ўсіх калгасах Рудніцкага сельсавету пастаноўлена было выходзіць на работу а 4 гадзіне раніцы. Фактычна-ж выходзяць калі каму ўздумаецца — у 6, 6 з палавой, у 7. У калгасе імя Сталіна 25 мая выйшлі ў поле толькі ў 11 гадз. раніцы. Праўда, 18 калгасьніц выйшлі ў поле ў 6 з палов. гадзін, але пачалі працаваць толькі ў 9. Брыгадзір Якаўлеў не зьявіўся своячасова, каб расставіць людзей. Ня дзіва, што ў калгасах Рудніцкага сельсавету конь у сярэднім узорвае ад 0,2 да 0,23 га.

Такое становішча ня толькі ў Рудніцкім сельсавеце. У калгасе імя Калініна, Селюцкага сельсавету, у брыгадзе Сабецкага, як правіла, у поле выходзяць не раней 8 гадзін, а працаваць пачынаюць толькі ў 9.

У калгасе «Труженік», Старасельскага сельсавету, у брыгадзе Максімава працоўная дысцыпліна зусім няма ні якая. Выходзяць выпадкі, калі на работу выходзяць не раней 12 гадзін. Прагулы ўвайшлі ў сыстэму. Барацьба з прагульшчыкамі не вядзецца. Вельмі дрэнна арганізавана праца і ў калгасе «Прагрэс», асабліва ў брыгадзе Войкава. Рабочы дзень у гэтай брыгадзе не перавышае 7 гадзін. Брыгадзіра ў полі ніколі ня ўбачыш. Норма ворыва на каня ў дзень не перавышае 0,16 га. Нормы сяўбы выконваюцца толькі на 40-50 проц.

Аднаасобны сактар у глыбокім прарыве. Прычын тут шукаць ня прыходзіцца. Гарком партыі па сутнасьці стаў на прымірэнчыя пазыцыі ў адносінах да шматлікіх фактаў апартуністычнага ігнараваньня аднаасобнікаў. Барацьбы з сабатажам сяўбы так сама не вядзецца.

У Старасельскім сельсавеце многія аднаасобнікі, як Іваноў, Архіпаўскі, Ерамееў, Грабаўскі, Міхайлоўскі і рад іншых, сабатуюць сяўбу. Старшыня сельсавету Аржаноўскі ўсё зьбіраецца прыцягнуць іх да адказнасьці.

Сяўба ільну ў раёне ігнаруецца. З году ў год сярод работнікаў земаддзелу можна чуць такія разважаньні: «Лён у нашым раёне займае зусім мізэрную ўдзельную вагу», або: «ільну ў нас амаль няма, ці варта аб ім гаварыць». Такія шкодныя разважаньні ўвайшлі ў традыцыю. У выніку—на 1 чэрвеня замест 1.668 га ільну засеяна 683.

У мінулым годзе Віцебшчына ўвесь час сяўбы знаходзілася на чорнай дошцы. І зараз яна таксама занесена на чорную дошку, што, бясспрэчна, кладзецца ганебнай плямай на ўсю віцебскую партыйную арганізацыю.

Гарком партыі павінен з гэтага зрабіць неабходныя вывады.

Партыйная арганізацыя Віцебску павінна ў самы кароткі тэрмін зрабіць рашучы пералом у ходзе сяўбы па раёну. Ліст ЦК і СНК гаркому партыі зьяўляецца апошнім папярэджаньнем.

Арк. Зарубежны.



ЗАПРАЎКА ТРАКТАРА ПЕРАД ВЫХАДАМ У ПОЛЕ (Полацкі р.).

Замоўчваюць сваё памылкі

МАГІЛЁЎ, 3. (Па тэлефону).

На 3 чэрвеня плян сяўбы па раёне выканан на 92 проц. Апошняя пяціднеўка дала прырост усяго на 6,5%.

Райком і райвыканком 25 мая, калі раён выканаў 83 проц. плану самазаспакоіліся і адклікалі членаў бюро райкому, упаўнаважаных кустоў з раёну. Толькі 3 чэрвеня, калі была атрымана тэлеграма ЦК і СНК, бюро райкому зноў накіравала ўпаўнаважаных і членаў бюро райкому ў раён.

Тэмпы разгорваньня сяўбы ў апошнія дні зьнізіліся. Зьявіліся новыя «аб'ектыўныя» прычыны: холадна, нельга сеяць.

ЦК і СНК у сваёй тэлеграме далі выразную ацэнку раённым арганізацыям у кіраўніцтве сяўбой.

Аднак, бюро райкому, абмеркаваўшы 3 чэрвеня гэту тэлеграму, у прынятай пастанове ні слова не ўспамянула аб сваім кіраўніцтве сяўбой, аб сваім самазаспакаеньні. Уся віна ўскладзена на парт'ячэйкі і сельсаветы, а райком тут ня прычым.

Нэйлін.

ПРАПОЛКАЙ НІХТО НЯ КІРУЕ

РАГАЧОЎ, 3.

Многія калгасы яшчэ і не распачыналі праполкі. У райземаддзеле пану пастроі: «падвядзем вынікі сяўбы, а потым пераключымся на праполку».

Плян праполкі да калгасаў не даведзен, тэрміны праполкі нават... ня вызначаны.

Некаторыя перадавыя калгасы раёну ўжо зараз распачалі праполку. Калгасы «Першы май» і «Шлях Леніна» (Запольскі сельсавет) канчаюць праполку азімай пшаніцы і пачалі рыхтавацца да ўборачнай. Жанчыны на праполцы разьбіты па зьвеньнях, расстаўлены па вучастках. Зьвеньні спаборнічаюць на лепшае правядзеньне праполачнай. Адсюль—беражлівыя адносіны да полі ва пшаніцы і ў той-жа час перавыкананьне норм.

Зараз у калгасе «Шлях Леніна» заканчваецца будаўніцтва гумна, зачышчаюцца ад сьмецьця і рамантуюцца памяшканьні для захаваньня новага ўраджаю.

Прыкладу гэтых калгасаў павінны пасьледваць адстаючыя.

Рагачоўскі райземаддзел павінен рашуча ўзмацніць кіраўніцтва справай праполкі.

Р. К.

Ад гарадзкой камісіі па чыстцы

Менская гарадзкая камісія КП(б)Б па чыстцы зьмяшчаецца ў ГарКК КП(б)Б (будынак гарадзкога савету), вул. Карла Маркса, дом № 14, 2 паверх, пакой 20-21. Тэлефоны: гарадзкі—23-140 і 23-148 і камутэтар ЦК КП(б)Б—22.

Усе матар'ялы, заявы аб чыстцы партыі просьба накіроўваць па ўказаным адрасе на імя сакратарыяту Менскай гарадзкой камісіі КП(б)Б па чыстцы.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

АГІТЦЯГНІК ЦК КП(б)Б У СІРОЦІНЕ

У ПАЛОНЕ КУЛАЦКІХ ТЭНДЭНЦЫЙ

СЛУЦАК, 2.

(цыяльнага карэспандэнта).

Вось ужо два тыдні, як Сіроцінскі раён занесен на чорную дошку за зрыў веснавой сяўбы.

На практыцы Пагарэліцкага сельсавету пакажам прычыны адставаньня Сіроцінчыны.

Сельсавет і парт'ячэйка кіруюць сельскай гаспадаркай паогул, без ніякага дыферэнцыяванага падыходу да кожнага калгасу, бяз уліку асаблівасьцяй кожнай гаспадаркі.

Калгас «Бязбожнік»—самы буйны ў сельсавеце. Яравы клін яго займае 530 га—амаль 50 проц. пасеўнай плошчы ўсяго сельсавету. Становішча ў калгасе вельмі напружнае, бо на кожнага каня прыпадае па 9 гэкт., а на кожнага калгасьніка па 12 гэкт. Ход сяўбы ў гэтым калгасе вырашае лёс пасеўнай ва ўсім сельсавеце. Ня гледзячы на гэта, сельсавет і ўпаўнаважаны РК і РВК Высачэнка аддавалі гэтаму калгасу менш увагі, чым іншым, значна меншым калгасам, як «Чырвоны сьцяг», імя Сталіна, дзе становішча лепшае.

На 30 мая калгас «Бязбожнік» засеяў усяго 35 проц. яравога кліну, у тым ліку 27 проц. ільну. І вось толькі зараз, калі ў калгасе сяўба пад пагрозай зрыву, сельсавет, парэшце, успомніў пра яго і паслаў на дапамогу брыгадзіра Дворкіна.

У калгасе-ж работа зусім не арганізавана. Напрыклад, брыгада № 3 працуе на маленькім вучастку ў 0,25 га. Усе працуюць скопам, уліку работы кожнага калгасьніка не вядзецца. Працоўная дысцыпліна не ўмацавана. 27 мая брыгада Буланчыкава вышла на работу ў 9 гадзін раніцы замест 4-х, а 29-га мая пакінула работу на гадзіну раней. Брыгада Еўдакімава 28 мая днём кінула работу і пашла мыцца ў лазьню, а 30-га мая вышла на работу толькі а 8-й гадзіне. Перапынак на сьнеданьне і абед цягнецца 5 гадзін. Ня дзіва, што для работы зусім не застаецца часу.

Раённае кіраўніцтва ня ведае, што канкрэтна робіцца на палёх, у брыгадах, калгасах. Райземаддзел працуе ўсьляпую. Загадчык райза Самусевіч прытрымліваецца кулацкай тэорыі аб шкоднасьці раньняй сяўбы ільну.

— Сіроціна,—заяўляе Самусевіч,— заўсёды пачынае сеяць пасьля «Лізаветы» (3 і 4 чэрвеня), бо позьні лён усё-ж лепшы, чым раньні.

Ня дзіва, што пры такіх установках раённага кіраўніцтва Сіроціна ня выходзіць з чорнай дошкі.

ПАЛЯРНЫ.

АДПОР НАСТРОЯМ САМАСУПАКОЮ

СЛУЦАК, 2.

У перадавых калгасах СЛУЧЧЫНЫ шырока разгарнуліся прапалачныя работы. Ганаровы сьцяг ЦК і СНК БССР гэтыя калгасы парашылі захаваць за сабой.

У калгасе «ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ» (Першамайскі сельсавет) яшчэ з 16 мая праводзілася падрыхтоўчая работа да прапалачнай. План прапалачнай быў распрацаван на праўленьні калгасу, а потым на агульным сходзе калгасьнікаў.

Першую праполку калгас скончыў да 1 чэрвеня. На час праполкі на гэту работу ў асноўным была пераключана жаночая сіла калгасу (36 жанчын). Сацыялістычнае спаборніцтва, якое атрымала шырокі размах у часе сяўбы, пашырылася на вучастках прапалачных работ. Калгасьніца Крот Аўдоцьця і Гузыеей Барбара перавыконваюць нормы выпрацоўкі.

У калгасе «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» праполка пачалася 18 мая. Авангардную ролю заняла камсамольская ячэйка калгасу. Узорныя прыклады паказалі камсамолкі Макаренка Хрысьціна, Пык Надзя, Гурбо Малашка, Магільш Надзя і Путчык Надзя.

Ударная работа, правільная расстаноўка сіл у брыгадах далі магчымасьць поўнасьцю скончыць праполку пшаніцы яшчэ 26 мая.

Аднак, многія калгасы Случчыны, супакоіўшыся на дасягнутых посьпехах у сяўбе, і па сёньняшні дзень не прыступілі да праполкі. Калгасы Ісерскага сельсавету, саўгас «Партызан» і лагэруль нават ня маюць плянаў прапалачных работ. Кіраўнікі саўгасу лічаць, што «зараз можна крыху адпачыць. Праполка не ўцячэ».

Няма барацьбы за якасьць праполкі. Так, калгас «Чырвоныя рочкі» арганізаваў праполку па-свойму. Старшыня калгасу распарадзіўся рваць пустазельле ў жыце і пшаніцы. Рвуць, як прыдзецца, топчуць пасевы, вырванае пустазельле кідаюць на полі, не захоўваючы самых элементарных агратэхнічных правіл праполкі.

Случкі райземаддзел таксама супакоўся на посьпехах сяўбы і пакуль толькі «па тэлефону» кіруе праполкай.

Случкі райземаддзел павінен паладзіць сапраўднае кіраўніцтва праполкай.

І. Н.

МЕНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛЯН ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, старшыні ЦВК БССР—т. ЧАРВЯКОВУ, старшыні Саўнаркому—тав. Галадзеду, наркамзему—т. БЭНЭКУ

ПАД ЦЬВЕРДЫМ КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б, ШЫРОКА РАЗГАРНУЎШЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ, МЕНСКІ РАЁН НА 3 ЧЭРВЕНЯ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ПЛЯН СЯЎБЫ.

ПЛЯН ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ПА РАЁНЕ ЎСТАНОЎЛЕН У 47.649 ГА (БЯЗ УКОСНАЙ КАНЮШЫНЫ). ЗАСЕЯНА 47.863 ГА. КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ ПЛЯН НА 103,8 ПРОЦ., САЎГАСЫ— НА 100,4 ПРОЦ. ПЛЯН ПАСЕВУ ЗБОЖЖАВЫХ І БУЛЬБЫ ВЫКАНАН З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ.

ПЛЯН СЯЎБЫ ПА РАЁНЕ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ВЫКАНАН НА 23 ДЗЁН РАНЕЙ ПАРАЎНАЛЬНА З 1932 ГОДАМ. ГЭТА ЯШЧЭ АДНА ПЕРАМОГА КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА, ПЕРАМОГА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ НАШАЙ ПАРТЫІ І КАНКРЭТНАГА АПЭРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА З БОКУ ЦК КП(б)Б.

ПРАЦЯГВАЕМ СЯЎБУ ГАРОДНІХ КУЛЬТУР І КАРМАВЫХ ТРАЎ. ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ, ПЕРАВЫКАНАЎШЫЯ ПЛЯН СЯЎБЫ, ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ НА ВОРЫВА ПАПАРАЎ І ПРАПОЛКУ З ТЫМ, КАБ СКОНЧЫЦЬ ГЭТУ РАБОТУ ВА ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ ТЭРМІНЫ.

САКРАТАР МЕНГАРКОМУ КП(б)Б КУДЗЕЛЬКА.
НАМ. СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ КАРАНЕЎСКІ.
ГАРЗЕМАДДЗЕЛ ЖАРЫН.

СМАЛЯВІЧЫ СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, ЦКК КП(б)Б—тав. ЛЫЧОВУ, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ, НКЗ БССР—тав. БЭНЭКУ, РЭДАКЦЫІ «ЗЬВЯЗДА».

СМАЛЯВІЦКІ РАЁН НА 31 МАЯ ВЫКАНАЎ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ПА КАЛГАСНЫМ І АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ НА 100,5 ПРОЦ. ЗБОЖЖАВЫХ ЗАСЕЯНА 18.201 ГА — 103 ПРОЦ., ВУЛЬБЫ 6.529 ГА — 104 ПРОЦ., ІЛЬНУ 1.350—96,5 ПРОЦ.

УСЯГО ЯРАВЫХ ЗАСЕЯНА 30.309 ГЭКТАРАЎ, ПРЫ ЗАДАНЬНІ Ў 29.789 ГА. СЯЎБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

САКРАТАР РК КП(б)Б КУДМАН.
СТАРШЫНЯ РКК КП(б)Б ХАДАРКЕВІЧ.
СТАРШЫНЯ РВК КОЗІНЦАЎ.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Пастановай камісіі ЦК КП(б)Б па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю на чырвоную дошку заносяцца наступныя перадавыя раёны, якія скончылі сяўбу:

ПАЎДНЕВАЯ ЗОНА:

РАГАЧОЎ — 107,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б ГЕЎРЫЕЎ, старшыня РВК МАЦЬКО.

ТУРАЎ — 104,2 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЛЯХАЎ, старшыня РВК НІКІФАРОВІЧ.

СЛУЦАК — 103,9 проц. Сакратар РК КП(б)Б СОСКІН, старшыня РВК КНЯЗЕЎ.

ЖЫТКАВІЧЫ — 103,7 Сакратар РК КП(б)Б БАГДАНАЎ, старшыня РВК БУДЗЬКО.

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА — 103,5 проц. Сакратар РК КП(б)Б КРАЦЭР, старшыня РВК УТКІН.

ЛЕЛЬЧЫЦЫ — 102,9 проц. Сакратар РК КП(б)Б СКАРАХОД, старшыня РВК КУПІНЕР.

СТАРЫЯ ДАРОГІ — 102,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЦЭЙЛІНГОЛЬД, старшыня РВК БАРСУКЕВІЧ.

БРАГІН — 102,5 проц. Сакратар РК КП(б)Б КОЖАР, старшыня АНІКЕЙЧЫК.

ХОЙНІКІ — 101,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б МАР'ЯНАЎ, старшыня РВК МІХЕЕЎ.

ПАРЫЧЫ — 101,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б СКОК, старшыня РВК САЧЫЛКА.

ЕЛЬСК — 101,5 проц. Сакратар РК КП(б)Б АЎЛАСЕНКА, старшыня РВК ЗЕНЧЫК.

ЛЮБАНЬ — 101,0 проц. Сакратар РК КП(б)Б КАВАЛЁЎ, старшыня РВК КЛІМАЎ.

СТАРОБІН — 100,6 проц. Сакратар РК КП(б)Б ВАРОНЧАНКА, старшыня РВК ГРЫШЧАНКА.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:

БАРЫСАЎ — 103,4 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЧАРНЫШОЎ, старшыня РВК БАРАНЧЫК.

МЕНСК — 100,0 проц. Сакратар ГК Кудзелька, старшыня гарсавету КАРАНЕЎСКІ.

КАПЫЛЬ — 102,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б ПШАК, старшыня РВК ВАЙЦЭХОЎСКІ.

БЯЛЫНІЧЫ — 100,9 проц. Сакратар РК КП(б)Б ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня РВК СУКАЛА.

СМАЛЯВІЧЫ — 100,3 проц. Сакратар РК КП(б)Б КУДМАН, старшыня РВК КОЗІНЦАЎ.

ПУХАВІЧЫ — 98,0 проц. Сакратар РК КП(б)Б ТАРАСАЎ, старшыня РВК СТУПАКОЎ.

ШКЛОЎ — 95,0 проц., па ільну 100 проц. Сакратар РК КП(б)Б ПІТЫМАЎ, старшыня РВК МІНЧОНАК.

Сярэдні процант па зоне — 86,1.

ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:

ПОЛАЦАК — 74,6 проц., па ільну — 92,1 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЯЎСЕЕНКА, старшыня РВК ШАБОЛТАС.

ЛЕПЕЛЬ — 73,5 проц., па ільну — 92,5 проц. Сакратар РК КП(б)Б ХІЖЫНКАЎ, старшыня РВК НАРОЕНКА.

Сярэдні процант па зоне — 58,0.

Чорная дошка

Пастановай камісіі ЦК КП(б)Б па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю за ганебныя тэмпы сяўбы занесены на чорную дошку наступныя раёны:

Паўночная зона

КАМАРЫН — 68,9 проц. Сакратар РК КП(б)Б КАВАЛЁЎ, старшыня РВК ВОЛКАЎ.

ЖЛОБІН — 85,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б ПЛЕШАКОЎ, старшыня РВК ТАМАШЭЎСКІ.

ВЕТКА — 83,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б КАЎРЫГІН, старшыня РВК СЬЛЮКІН.

Сярэдні па зоне — 86,1 проц.

Цэнтральная зона

МСЬЦІСЛАЎЕ — 66,4 проц. Сакратар РК КП(б)Б РАМАНЕНКА, старшыня РВК МАРОН.

ГОРКІ — 71,3 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЧОРНАБРОДАЎ, старшыня РВК КАНДРАЛЬ.

ТАЛАЧЫН — 66,0 проц. Сакратар РК КП(б)Б СЛАВІН, старшыня РВК ЛОЦМАНАЎ.

Паўднёвая зона

ІСІРОЦІНА — 39,1 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІРОНЕНКА, старшыня РВК РАЖНОЎСКІ.

ГАРАДОК — 39,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЭЛЬМАН, старшыня РВК ЕЎДАСЕЎ.

ВІЦЕБСК — 52,9 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІЦЬКОЎ, старшыня РВК КАРДАШЭНКА.

Сярэдні процант па зоне — 58.

Аб праверцы характару і прычын масавага здсеву камуністаў у віцебскай партарганізацыі

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

1. ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б лічаць, што факты адрыву значнай часткі членаў партыі і кандыдатаў (звыш 350 чал.) ад партыйнага жыцьця (няўплата ад 6 месяцаў да 2-х год членскіх узносаў, неведаньне партсходаў і палітвучобы, адсутнасьць нагрузак і інш.), якія маюць месца на важнейшых прадпрыемствах Віцебску («Дзьвіна», «Сьцяг індустрыялізацыі», «Чырвоны мэталіст» і інш.) зьявіліся вынікам таго, што важнейшыя пастановы і канкрэтныя ўказаньні ЦК аб перабудове партработы (пастанова ліпеньскага пленуму ЦК, усебеларускай нарады парторгаў і кастрычніцкая аргпартнарада, рашэньне бюро аб партдні, дні кандыдата, членскіх узносах, умацаваньне сярэдняга партзьвяна і інш.) не атрымалі патрэбнага адбітку ў штодзённай практычнай рабоце віцебскай партарганізацыі.

2. Віцебскі гарком і гарКК КП(б)Б замест прынцыповай палітычнай ацэнкі ўказаных фактаў, мабілізацыі вакол іх увагі ўсёй партарганізацыі, узьняцьця актыўнасьці партыйных мас і якасьці партработы, абмежаваліся простай канстатацыяй фактаў, зводзячы ўсё пытаньне да дрэннай пастаноўкі ўліку і невыстарчальнага выяўленьня пасыўных членаў партыі ячэйкамі.

Гэта невыстарчальна і направільна арыентавала арганізацыю на барацьбу з указанымі зьявішчамі і ў рэзультаце ў радзе месц («Дзьвіна», «Сьцяг індустрыялізацыі» і інш.) праверка суправоджалася мерамі партыйнага спагнаньня і мэханічным выключэньнем з радоў партыі правяўшых пасыўнасьць да партжыцьця членаў і кандыдатаў КП(б)Б, без праявленьня адпаведнай работы з імі.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК, указваючы ГК і гарКК на такое недапушчальнае становішча партработы ў арганізацыі, прапануюць:

1. У адпаведнасьці з пастановай ЦК КП(б)Б ад 2 мая 1933 г. аб праграцоўцы пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 29 красавіка 1933 г. пра чыстку партыі, шырока разгарнуць падрыхтоўчую работу да чысткі партыі, забясьпечваючы:

а) поўны ахоп усёй партарганізацыі, кожнага партыйца і ўцягваньне ў гэту работу рабочых мас;

б) выяўленьне і павышэньне на падставе бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі авангардной ролі камуністаў і ўдзел кожнага ў партжыцьці;

в) выкрыцьцё і зьнішчэньне недахопаў работы ячэек і ўзмацненьне іх кіраўніцтва гаспадарчага - палітычным жыцьцём прадпрыемства, упязваючы правядзеньне ўсёй гэтай работы з выкананьнем прамфінплану як па колькасных, так і па якасных паказальніках.

2. Адзначаючы выключную блытаніну ў справе ўліку камуністаў у радзе парткалектываў («Чырвоны мэталіст», «Сьцяг індустрыялізацыі», «Дзьвіна» і інш.), абвязваць гарком і гарКК у дзкадны тэрмін праверыць і ўпарадкаваць стан колькаснага і якаснага ўліку камуністаў у парткалектывах, цэх'ячэйках, пасьля чаго правесьці інструкцыйную нараду вучотчыкаў па пытаньні пастаноўкі ўліку членаў і кандыдатаў партыі.

3. У гэты-ж тэрмін аформіць, як мэханічна выбыўшых з радоў партыі, сапраўдны баляст, выпадкова траплівшых у рады партыі, даўно адарваных і ня маючых ніякай сувязі з партыяй, якія ня плацяць членскіх узносаў, не наведваюць партсходаў і г. д. Перабудаваць работу гаркому і гарКК так, каб забясьпечыць жывое і канкрэтнае кіраўніцтва цэх'ячэйкамі і партгрупамі і ежазьяньне штодзённай практычнай дапамогі гэтым мізавым партзьвеньням.

4. ЦК і ЦКК лічаць неабходным для ўсіх ГК, РК, гарКК і райКК КП(б)Б улічыць урокі віцебскай арганізацыі, разгарнуць у сувязі з надыходзячай чысткай партыі падрыхтоўчую работу, выяўляючы становішча работы ячэек, арганізатарскую і кіруючую ролю кожнага камуніста на вытворчасьці і ўдзел у партыйным жыцьці, здзейсняючы да чысткі сапраўдны баляст, адарваўшыся ад партыі (якія ня плацяць членскіх узносаў, не наведваюць сходаў і г. д.).



Ленінградзкі завод «Красный Путиловец» выпусьціў нядаўна 6 такіх аўтамабіляў.

21-га мая Масква сустракала ленінградзкіх шматлітражных хуткаводных гасьцей—аўтамабіляй, «Л-1», якія зрабілі пробны прабег Ленінград—Масква. Усе 6 машын «Л-1» у прабегу паказалі выключна добрыя ўласьцівасьці. Выразная, бесьперабойная работа матору, ніякіх паломак і затрымак у дарозе. Машыны ішлі з сярэдняй хуткасьцю 60 клм., а часам хуткасьць была 80-85, пры максымальнай хуткасьці машын—114 клм.

Аб ходзе выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва

З пастановы ЦК КП(б)Б і Савету Народных Камісараў БССР

Канстатаваць, што пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 12 лютага і 6 сакавіка 1933 году ня выкананы.

Надаючы справе своячасовага і якаснага выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне, ЦК КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Прапанаваць усім установам, арганізацыям, раённым камітэтам партыі і райвыканкомам, маючым заданьні па дарбудаўніцтву, дабіцца неадкладнага, рашучага пералому ў адносінах выкананьня работ па дарбудаўніцтву, пачаўшы гэтыя работы першачарговымі і асабліва важнымі і прыняць рашучыя захады па забясьпячэньні дарбудаўніцтва вывазкай будаўнічых матар'ялаў, каменьня, шчэбню, гравія, пяску ў копь касьці і ў тэрміны, указаныя ў дадатку, даводзячы нормы і тэрміны да кожнага калгасьніка і аднаасобніка. Канчатковым тэрмінам поўнай вывазкі будматар'ялаў устанавіць 15 ліпеня.

2. Абавязаць РК КП(б)Б і райвыканкомы, пад пэрсанальную адказнасьць сакратара РК і старшыні РВК, забясьпечыць з 1 чэрвеня масавы выхад рабгужсіпы, з разьлікам поўнай вывазкі будматар'ялаў да 15 ліпеня г. г. Раёнам, з посьпехам скончыўшым сяўбу (Слуцак, Барысаў, Чырвоная Слабада і інш.), зараз-жа перакінуць рабгужсіпу на дарбудаўніцтва.

3. Прызначыць упаўнаважаным ЦК і СНК БССР па дарбудаўніцтву тав. ФРУМКІНА і намесьніка ўпаўнаважанага ЦК БАГАМОЛАВА.

4. Прапанаваць тав. Фрумкіну:

а) Забясьпечыць неадкладна разгортваньне работ, для чаго накіраваць да канца будаўнічага сэзону на вучасткі адказных работнікаў і праверану інжынэрна-тахнічны пэрсанал з апарату Галоўдартрансу і кантор.

б) Забясьпечыць якасьць выконваемых работ, якасьць вывазімых матар'ялаў, узмацніўшы тэхнічнае кіраўніцтва і кантроль, выпучыўшы спэцыяль на адказных прыёмшчыкаў.

в) Выпучыць спэцыяльны фонд прэміяваньня раённу, сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў і працоўных аднаасобнікаў, пасьпяхова выконваючых планы вывазкі дарбудаматар'ялаў і правядзеньня работ, у разьмеры 75.000 руб.

г) Неадкладна разгарнуць поўным ходам работы па будаўніцтву пад'язных шляхоў, з разьлікам іх скончваньня ва ўстаноўленыя тэрміны.

д) Улічваючы магчымасьць масавых распрацовак глыбінната каменьня ў Гарадоцкім раёне, неадкладна правесьці тэапэгічныя разьведкі магутнасьці заляганьня каменьня і аб рэзультатах далажыць СНК БССР.

е) Неадкладна ліквідаваць запазычанасьць за дарбудаўніцтва, зрабіўшы разьлік з калгасьнікамі і аднаасобнікамі за праведзеныя работы ў 1932 і бягучым годзе.

5. Абавязаць ЦСПСБ (т. ЛІСКОВІЧА), ЦК ЛКСМБ (т. ГЕРЦОВІЧА), Наркамзем (т. РЭВІНСКАГА), Наркамсаўгасаў (т. СЬМІРНОВА), ВСФК (т. КУЗЬНЯЦОВА), ЦС Аўтадору і рэдакцыі цэнтральных і раённых газэт неадкладна ўключыцца ва ўдарную работу па забясьпячэньні поўнага выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва, прадставіўшы ў транспартны сэктар ЦК КП(б)Б не пазьней 1 чэрвеня г. г. пляны канкрэтных мерапрыемстваў.

6. Адзначаючы невыкананьне БКС і Наркамснабам пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 6 сакавіка 1933 г. за № 323-28—аб уключэньні дарсэкцыі ў плянавае снабжэньне фондамі грамадзкага харчаваньня і Інвэнтару,—абавязаць т. т. ВЕРБА (БКС) і ГУРЭВІЧА (Наркамснаб) не пазьней 25 мая 1933 г. дапажыць СНК БССР аб прынятых імі мерах у выкананьне паказанай вышэй пастановы.

7. За незабясьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў у разгортваньні работ вучдору 711 т. КРУКОЎСКАМУ абвясьціць вымову, парторгу ОДПР 4 т. ВАЛАСЕВІЧУ паставіць на від і перавесьці, як не справяўшагося з работай, на менш адказны вучастак.

Прыняць да ведама заяву т. ФРУМКІНА, што за няўмелае кіраўніцтва работамі па важнейшых маршрутах ім зьнят з работы ОДПР 4 т. КРАСЬНІКАЎ і прыцягнут да адказнасьці ОДПР 5 САКАЛОЎСКІ.

8. Папярэдзіць усе трыкутнікі вучасткаў, аўтаматрадаў, мэханізмаў, намандаваньне ваенспэцчасьцей т/а, што напрыняцьце імі самых рашучых мер для забясьпячэньня сапраўднага пералому ў разгортваньні работ пацягне за сабой самыя суровыя меры ўзьдзейнасьці.

9. ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць партыйным арганізацыям, камсамолу, райвыканкомам і прафарганізацыям неадкладна ўзмацніць партыйную, камсамольскую, прафсэкцыйную і культурна-масавую работу сярод рабочых, разьвіваючы і ўкараняючы сацыялістычныя формы і мэтады працы (сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчнае плянаваньне і г. д.), дабіваючыся сапраўднай мабілізацыі мас на пасьпяховае выкананьне пляну дарожнага будаўніцтва 1933 году.

10. Лічыць неабходным заслухоўваць інфармацыю тав. Фрумкіна аб ходзе ўсяго дарожнага будаўніцтва на чарговых пасяджэньнях СНК.

Сакратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Агляд друку

Дзьве газэты--два вынікі

(«Прамень камунізму»—орган Шклоўскага РК КП(б)Б, РВК і РПС, «Ленінскі шлях»—орган Слуцкага РК КП(б)Б, РВК і райпрафсавету)

«...Пры ўсіх магчымасьцях поўнай рэалізацыі кантрольнай лічбы па «пазыцы другой пяцігодкі» і на ват перавыкананьня сумы падпіскі, ход рэалізацыі яе ідзе недапушчальна марудлівымі тэмпамі, і асабліва на вёсцы, дзе рэалізавана толькі 18,9 проц. заданьня...»

Такое «выпаходзтва» зрабіла газэта «Прамень камунізму» 28 мая 1933 году, зьмясьціўшы побач са зводкай аб ходзе рэалізацыі пазыкі па рабку поштатэлеграму райкому КП(б)Б. Гэта значыць тады, калі рад перадавых раёнаў поўнасьцю ужо выканалі заданьне па рэалізацыі.

У гэтым сумным паведамленьні «П. К.» не абышлося без таго, каб да сумы рэалізацыі не дадаць зусім нямнога—толькі 3 проц. дутых лічбаў. Відаць гэта з таго, што на 30 мая па Шклоўскаму раёну рэалізавана пазыкі на вёсцы толькі 15 проц. заданьня. Зразумела, на 28 мая ніяк не магло быць 18 проц.

Кароткая вытрымка з поштатэлеграмы, разам з дутай лічбай вельмі выраз на характарызуюць нікудышнюю работу газэты «П. К.». У рэалізацыі пазыкі. Газэта пытаньнем рэалізацыі пазыкі не займаецца, яна стаіць у баку ад гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі.

Праўда, нельга сказаць, што газэта зусім абходзіць гэта пытаньне. Не... Яна нават своячасова, ня ў прыклад смаляніцкай газэце, надрукавала пастанову ўраду аб выпуску пазыкі. Больш таго, дае і падборкі аб ходзе рэалізацыі, з вельмі «вытрымаными шапкамі» накшталт «ні аднаго працоўнага без аблігацыі пазыкі», або «неадкладна пакончыць з адставаньнем у рэалізацыі пазыкі».

Усё гэта, аднак, «шапкі». Пад шапкамі зусім пустое месца. Няма галоўнага—матар'ялу, які-б сапраўды паўдарнаму мабілізаваў шырокія працоўныя масы раёну на правядзеньне гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі.

Адсутнічае абмен вопытам работы перадавых калгасаў, перадавых сельсаветаў. Няма апэрацыйнасьці. Ёсьць калі-ні-калі голыя, нічога неаговорчыя, вельмі часта блытаныя і дутыя лічбы.

Між тым, апэрацыйнасьці мы ад газэты «П. К.» маем права патрабаваць больш, чым ад любой раённай газэты ўжо толькі хоць-бы таму, што яна ўвесь час на працягу кампаніі рэалізацыі пазыкі выходзіла і выходзіць штодзённа. І таму мае ўсе магчымасьці гэта зрабіць.

Што мы знаходзім аб пазыцы ў «П. К.»? 17 мая падборка паказвае, якая раённая ўстанова на колькі падпісалася. 22 мая—зводка аб ходзе рэалізацыі пазыкі па сельсаветах, бяз усялякіх каментараў, і ліст ад курсанта Беларускай Вайсковай Школы да калгасьнікаў і аднаасобнікаў Шклоўшчыны з заклікам падпісвацца на пазыку. 23—зноў зводка аб рэалізацыі пазыкі. 25 мая—тры заметкі, у тым ліку допіс «Разгортваем работу ў калгасах», які паведамляе, што МТС прыступае да правядзеньня падпіскі ў калгасах.

Характэрна, што тады, калі ўжо рад раёнаў Беларусі ня толькі поўнасьцю выканалі заданьне па рэалізацыі пазыкі, але і перавыканалі, «П. К.» паведамляе, што Шклоўская МТС прыступае да рэалізацыі.

Ва ўсім скупа паданым матар'яле вы ня знойдзеце ні аднаго жывога чалавека, ні аднаго прыкладу работы перадавых сельсаветаў, калгасаў аднаасобнікам.

Нельга дапусьціць, што гэтых прыкладаў няма ў раёне. Яны ёсьць, але аб іх ня ведае газэта, таксама, як яна ня ведае аб тым, што наогул робіцца ў раёне па рэалізацыі пазыкі. Як гэта ня дзіва, але факт.

Ня ведаць гэтага, гэта значыць недаацэньваць усёй палітычнай важнасьці гэтай вялізарнейшай гаспадарчай кампаніі, якой зьяўляецца рэалізацыя пазыкі.

Адсутуль зусім невыпадкова, што Шклоўскі раён цягнецца ў хвасьце па рэалізацыі пазыкі, А гэта іменна так. Заданьне на 30 мая па раёну выкананa толькі на 45,2 проц., у тым ліку па вёсцы на 15 проц. (не 18, а 15 проц.) і то толькі за лік калгасаў, па якіх кантрольная лічба выкананa на 29 проц. Сярод аднаасобнага сэктару не рэалізавана ні адной аблігацыі.

Так змагаецца за выкананьне важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі, як змагаецца «П. К.» — нельга. Газэта павінна тэрмінова, спачатку да канца перабудаваць сваю работу па рэалізацыі пазыкі з тым, каб у бліжэйшы час забясьпечыць выкананьне заданьня.

Даваць жывых людзей, паказваць канкрэтныя факты іх работы, арганізаваць абмен вопытам работы перадавых сельсаветаў, калгасаў і аднаасобнікаў,—вось тыя зьвеньні, без якіх нельга з посьпехам правесьці рэалізацыю пазыкі. За гэта зьвяно «П. К.» павінна ўхапіцца зараз-жа, каб выцягнуць раён з ганебнага прарыву.

* * *

Поўная процілегласьцю «П. К.» зьяўляецца слуцкая раённая газэта «Ленінскі шлях». Яна з першага-ж дня на сваіх старонках сапраўды па-ўдарнаму паставіла работу па асьвятленьні ходу рэалізацыі пазыкі.

Даволі пераглядзець адну—дзьве газэты, каб убачыць, што «Л. Ш.» не пакладаецца на самацёк, не зьяўляецца простым фіксатарам даўно мінулых, голых фактаў, а іменна арганізуе матар'ял, кіруе кампаніяй.

Возьмем, для прыкладу, паласу ад 19 мая. Яна ўся зіхаціць жывымі людзьмі, фактамі канкрэтнай работы. Яна перадае жывы вопыт работы калгасу імя Молатава, дзе падпіска была праведзена пры шырока разгорнутым сацспаборніцтве і ўдарніцтве, і тут-жа перадае вынікі рэалізацыі пазыкі ў гэтым калгасе.

На гэтай старонцы вы знойдзеце і работнікаў гарпэнажытаварыства, і рабочых саюзаў гаравзкіх прадпрыемстваў, і ўдарнікаў калгасных палёў, аднаасобнікаў і настаўнікаў, і мэдработнікаў—ударнікаў фінфронту. Адным словам, усё тое аб чым і ўспаміну няма на старонках шклоўскай газэты «П. К.».

«Л. Ш.», арганізуючы кампанію, папулярызуе формы і мэтады работы і дае напрамак, як трэба працаваць для таго,

каб закончыць рэалізацыю пазыкі у бліжэйшы час.

Папулярызуе асобных ударнікаў вытворчасьці, якія зьяўляюцца ўдарнікамі па рэалізацыі пазыкі»,—паказваючы іх работу, прозьвішчы і суму падпіскі.

Слушкі раён першым скончыў веснавую сяўбу і атрымаў пераходны сьцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР. «Л. Ш.» вакол гэтага ў перадавым артыкуле мабілізуе масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на пасьпяховае завяршэньне кампаніі па рэалізацыі пазыкі. Даючы жорсткі адпор імкненьням асобных парт'ячэек і сельсаветаў адцягнуць рэалізацыю пазыку пакуль ня скончаць сяўбы, «Л. Ш.» у перадавым артыкуле завастрае ўвагу ўсёй грамадзкасьці на недапушчальнасьць падобных фактаў.

«... Такім апартуністычным устаноўкам на «чарговасьць кампаніі», пад якімі хаваецца няўменьне пабальшавіцку мабілізаваць масы, спалучыць пасьпяховае і высокакаслае поўнае завяршэньне сяўбы з правядзеньнем важнейшай палітычнай кампаніі, якой зьяўляецца рэалізацыя пазыкі, трэба даць рашучы адпор».

Тут-жа паказваюцца жывыя людзі:

«... Старшыня Кастрычніцкага сельсавету Вапынец, старшыня Шышчыцкага сельсавету Каляда і сакратар парт'ячэйкі Шостак—нічога ня робяць па рэалізацыі пазыкі».

23 мая зноў даецца паласа, на якой прыводзяцца матар'ялы, як працуюць асобныя сельсаветы, партыйныя і камсамольскія ячэйкі, якія формы і мэтады работы па рэалізацыі пазыкі ўжываюцца ў пасобных калгасах.

24 мая падборка, у якой побач з іншымі матар'ялямі друкуецца ліст дэлегатаў-ўдзелаў калгасьнікаў-ударнікаў і перадавых калгасаў Слуцкага раёну, прысьвечаны сацспаборніцтву з Заходняй вобласьцю і Бабруйскім раёнам. У гэтым лісьце не адмінаецца і рэалізацыя пазыкі.

Адстае аднаасобны сэктар. «Л. Ш.» на працягу ўсёй кампаніі не выпускае яго з-пад сваёй увагі. 8 нумару ў нумар яна асьвятляе як у сельсаветах праходзіць рэалізацыя сярод аднаасобнага сэктару 26 мая гэтаму пытаньню адводзіцца паласа. Пад агульнай шапкай «Ліквідаваць адставаньне аднаасобнага сэктару», «Л. Ш.» прыводзіць рад фактаў ходу рэалізацыі пазыкі ў асобных вёсках і падкрэсьлівае:

«Галавая задача парт'ячэек, сельсаветаў і ўдарнікаў фінфронту, літаральна на працягу двух дзён зрабіць круты пералом, прыйсьці на раённы зьлёт ударнікаў фінфронту—на 23 мая—са 100-проц. рэалізацыяй пазыкі».

29 мая зноў адводзіцца паласа, на якой у артыкуле «Фронт рэалізацыі пазыкі павінен быць выпраўлен» «Л. Ш.» гаворыць, што

«Першамайскі сельсавет сярод працоўных аднаасобнікаў нічога не рэалізаваў... Недаацэнка аднаасобнага сэктару існуе і на сёкешні дзень».

На гэтай-жа паласе перадаецца вопыт работы Ісерскага сельсавету па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў, дае

«...быў праведзен зьлёт працоўных аднаасобнікаў. Зьлёт поўнасьцю мабілізаваўся на хутчайшую рэалізацыю пазыкі сярод аднаасобнага сэктару. Выбраны ўпаўнаважаныя па рэалізацыі і г. д.».

* * *

Зразумела, вельмі цяжка ў агляднае перадаць усю тую вялікую работу, якую праводзіла і праводзіць «Л. Ш.» Ня ўнікнула яна і некаторых недахопаў. У прыватнасьці, работа камсамолу, работа камсодаў, выпала з поля зроку газэты «Л. Ш.». Маса матар'ялаў, якая зьявілася ў газэце па рэалізацыі пазыкі, не закрывала ў належнай ступені работы прафсаюзных арганізацый.

Але, ня гледзячы на гэта, «Л. Ш.» можа быць пастаўлен у прыклад работы іншым раённым газэтам. Асабліва шклоўская газэта «Прамень камунізму» павінна пераняць формы і мэтады работы «Ленінскага шляху» і па яго ўзору перабудаваць сваю работу.

Слуцкі раён выканаў агульны план рэалізацыі пазыкі на 30 мая на 103 проц., у тым ліку заданьне па вёсцы выкананa на 101,9 проц. Вялізарнейшая заслуга ў гэтым і газэты «Ленінскі шлях».

ПРЭМІІ ЛЕПШЫМ

Вялізарнейшую работу па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі сярод калгасьнікаў і аднаасобнага сэктару правялі работнікі Крынскага сельсавету, Лёзьнянскага раёну.

Шырока разгарнуўшы палітычна-масавую работу, увязаўшы яе з валачамі веснавой сяўбы, сельскі савет дабіўся выкананьня заданьня ў 32 тыс. руб. на працягу адной дэкады, даўшы 32.970 руб. рэалізацыі пазыкі.

План рэалізацыі пазыкі па Крынскім сельсавеце выкананы ня толькі па групе рабочых і служачых, але і па калгасах і па аднаасобным сэктары.

Улічыўшы ўсё гэта, цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкредыту і ашчаднай справе пры прэзыдыуме ЦВК БССР і НКФ БССР пастанавілі прэміяваць пачэснымі граматамі цэнтральнай камісіі і грашовай узнагародай па 100 руб. старшыню Крынскага сельсавету, ён-жа і старшыня селькамсоду Самаварава, і ўпаўнаважаных Лёзьнянскага РК КП(б)Б па гэтым сельсавеце Аронава і Кавалеўскага.

Цэнтральная камісія садзейнасьці разам з гэтым зьвярнулася да Крынскага сельсавету з прапановай, каб апошні ўзяў на грамадзкі буксір адзін з адстаючых у рэалізацыі пазыкі сельсаветаў шляхам пасылкі туды ўдарнай брыгады, а таксама прапанавай лёзьнянскай раённай камісіі садзейнасьці даслаць тэрмінова ў цэнтральную камісію матар'ялы аб лепшых ударніках-калгасьніках Крынскага сельсавету, якія правялі сябе ў правядзеньні рэалізацыі пазыкі на прадмет іх прэміяваньня.

М. А.

ПА ЦІПАЛЬТАХ СВЕТУ СССР

ГІГАНЦКІЯ ЗЛАКІ Ў ДАЛІНЕ АМУ-ДАР'І

Кіраўнік работ пясчана-пустыннага Інстытуту Акадэміі Навук СССР праф. Дубянскі адкрыў у Сярэдняй Азіі заросьлі двух дзіка-растучых гіганцкіх злакаў. Вышыня аднаго з іх—5 мэтраў, другога—каля 2. Знойдзеныя расьліны займаюць вялікую плошчу ў даліне рэкі Аму-Дар'і. З іх можна атрымаць паперу вельмі добрай якасьці. Першыя вопыты скарыстаньня гэтых расьлін, як сырцу для паперы, далі станоўчыя вынікі. Зараз распрацоўваецца праект пабудовы ў Туркмэніі папярова-цэлюлёзнага камбінату з гадавой прадукцыйнасьцю ў 20.000 тон. («Туркменская искра»).

ПЕРШЫ КАРАВАН З УХЦІНСКАЙ НАФТАЙ

Дзесяткі год біліся капіталісты над асваеньнем прыродных багацьцяў Паўночнага краю. Але іх досьледы далі мізэрныя вынікі. Не ўдаліся спробы капіталістаў атрымаць нафту ў Ухт-Пячорскім раёне. Вырашэньне гэтай задачы стала магчымым толькі пры савецкай уладзе.

Зараз прапоўнымі Паўночнага краю атрымана вялікая перамога. На вучастку Чыб'ю здабыта першая ухцінская нафта. Ухта-Пячорскі трэст пакіраваў караван з 6 баржаў з нафтай для патрэб прамысловасьці і транспарту Паўночнага краю. («Правда Севера»).

ПЯЦЬ МІЛЬЁНАЎ КОНСКІХ СІЛ ШТОГОД

З уступленьнем у строй Чалябінскага трактарнага заводу пачалася новая эра савецкай трактарнай прамысловасьці. Новая тому, што ня толькі павялічылася вытворчая магутнасьць прамысловасьці, але ўпяршыню арганізована масавы выпуск трактараў новага тыпу — гусянічных.

Вось як расла прадукцыя трактарных заводаў (бяз Пуцілаўскага):

У 1930 годзе Сталінградзкі трактарны даў краіне 1.006 машын.

У 1931 г. СТЗ і ХТЗ далі 19.756 трактараў.

У 1932 г. Сталінградзкі і Харкаўскі заводы выпусьцілі 44.842 трактары.

У 1933 г. тры заводы, уключаючы Чалябінскі, павінны даць звыш 70.000 трактараў.

Савецкі саюз заняў першае месца ў сусьветнай трактарнай прамысловасьці. Сельская гаспадарка будзе штогодна атрымліваць 5 мільёнаў мэханізаваных конскіх сілаў. («Гудок»).

УСЕСАЮЗНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ГРАМАДЗКІМ ХАРЧАВАНЬНІ

31 мая ў Маскве адкрылася першая ўсесаюзная вытворчая канфэрэнцыя грамадзкага харчаваньня. На канфэрэнцыю зьехаліся 400 дэлегатаў—кухароў, прадстаўнікоў заводзкіх сталовак, лепшых ударнікаў цэхаў харчаваньня.

Да пачатку першай пяцігодкі ў Савецкім саюзе было 1.500 сталовак, якія выпускалі 2 мільёны страў. Зараз мы маем дзесяткі тысяч рабочых сталовак, якія выпускаюць 30 мільёнаў страў штодзённа. У СССР працуюць 106 вялікіх фабрык-кухняў.

На канфэрэнцыі будзе заслухан рад дакладаў аб задачах і пэрспэктывах грамадзкага харчаваньня і справаздачы цэхаў харчаваньня буйнейшых прадпрыемстваў. У работах канфэрэнцыі прымаюць удзел 3 навукова-дасьледчых інстытуты. («За пищевую индустрию»).

ПІСЬМЕНЬНІК БРУНО ЯСЕНСКІ ЕДЗЕ НА ПАМІР

У Сталінабад (сталіца Таджыкістану) прыехаў польскі пісьменьнік Бруно Ясенскі. Ён будзе там працаваць над другой часткай кнігі «Чалавек мяняе скуру». Скончыўшы кнігу, Бруно Ясенскі разам з пісьменьнікам Лугоўскім паедзе на Памір («Вечерняя Москва»).

УСЕСАЮЗНАЯ ВЫСТАЎКА ВЫНАХОДАК

Заканчваецца будаўніцтва ўсесаюзнай выстаўкі рабочага вынаходзтва і рацыяналізацыі ў Маскве. Выстаўка адкрыецца праз месяц-паўтара. Ідэя выстаўкі — паказаць дасягненьні вынаходкай мысьлі ў СССР.

Выстаўка зьмяшчае 15 розных аддзелаў з 10 тысячамі экспанатаў. Кожны наведвальнік — хэмік, ткач, кіно-мэханік, токар — знойдзе тут сваю вытворчасьць. У 15 залах выстаўкі размешчаны дзесяткі варштатаў, машын, розных прыладаў, самыя дакладныя навейшыя вынаходкі.

Найбольш цікавыя экспанаты — аэраларога Вальднэра, судно, якім кіруюць па радыё, першы ў СССР фатограф-аўтамат, турбабур Калядюшнікава і інш. Набудавана спэцыяльная галарэя бюстаў і партратаў рабочых-вынаходцаў. Выстаўка будавалася амаль два гады. («Вечерняя Москва»).

Ф. Глобіг

Пралетарская салідарнасьць на фронце антыфашысцкай барацьбы

(Да 5-га міжнароднага дня салідарнасьці Міжрабпому)

Калі ў капіталістычным сьвеце каля пяцідзесяці мільёнаў беспрацоўных, ня кажучы заработку, на працягу палага году даводзіцца шукаць работы; калі ў рэзультаце абвастрэньня агульнага крызісу штодзённа цярпець крушэньне дзесяткі тысяч сялянскіх пралетарскіх жыцьцяў пробкі ганцлярэй; калі замест разьвіцьця прадукцыйных сіл назіраецца масавае зьнішчэньне харчовых і іншых прадуктаў—тады наступае становішча, прадказанае ўжо Марксам і Энгельсам у «Камуністычным маніфэсце».

«Яна (буржуазія) ніводзьна пакінула таму, што яна вядомна зайсьць нечыць свайму рабу існаваньне вакат у межах яго работа, таму, што яна вычуваюна даць яму апусьціцца да такога становішча, калі яна сама павінна яго карміць, замест таго, каб карміцца за яго кошт. Грамадзтва ня можа больш жыць пад яе ўладай, г. зн. яе жыцьцё несумяшчальна больш з грамадзтвам».

Такое становішча рэчаў прымусіла германскую буржуазію ўзьняць зброю фашысцкай дыктатуры для абароны свайго ліцкага клясавага панаваньня ад вастрэйшага пад кіраўніцтвам камуністы пралетарыяту. З прычыны вялікай галечы мас, якая ўзьняцце ўсё больш і больш шырокія пласты насельніцтва ў вказыцую пануючыя ў даны момант колам, буржуазія скарыстоўвае сродак разлагаючай дабрачынасьці для супакаеньня і ашукання галадаючых.

Зыходзячы з тых-жа мерка-ваньняў, Луі-Напалеон узброіў свае сьнежаньскія банды ня толькі тоўстымі дубінкамі, але таксама і гарачымі сасіскамі і іншымі смачнымі рэчамі. Наступленьне рэакцыі замаскавалася «грамадзкай дабрачыннасьцю». З гэтых-жа мерка-ваньняў Эберт і Шэйдэман пасьля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 году, калі гарнізі і мэталісты Рурскай вобласьці змагаліся за «поўную сацыялізацыю», пасылалі туды паперамена—то белагвардзейскія атрады і палітыйскія войскі, то дзенную гатовую вопратку спэкулянта Окларока і горкае сала Бармата.

Таму-ж Гітлер-Герман-Гебэльс зьнішчаюць камуністычны авангард, канцэнтруюць тыя рэвалюцыйныя элементы, якія не ўдалося фізічна зьнішчыць, у озаіх барбарскіх лягерах і арганізуюць у той-жа час масавае харчаваньне бестрацоўных, нацыянальныя Дні Дапамогі, Дні збору сродкаў, калі германскія дзяўчыны, упрыгожныя фашысцкімі значкамі, і нацыянал-сацыялістычныя забойцы-штурмавікі прагаюць белыя квяткі. Германскія фашысты тым лягчэй могуць даводзіць сабе гэтыя маёўры ў мэтах супакоеньня і ашукання галодных мас, што яны ім нічога не каштуюць; расходы ляцуць дробныя гандляры, ягурэйскія буйныя капіталісты, або проста запалоханыя ягурэі, дый самі галодныя пралетары ў выглядзе простых і ўкосных падаткаў.

Калі ўжо і ў папярэднія гады—пад высокім апякунствам Гінцэнбурга і Заверынга—амаль усе без выключэньня буржуазныя партыі, ад нацыянал-сацыялістаў да сацыял-дэмакратыі, займаліся ў тэй ці іншай форме «грамадзкай дабрачыннасьцю», то пры імпэрскім міністры ілюзіі, Гебэльсе, дабрачыннасьць ператварыла ся ў важную зброю палітычнага панаваньня і карупцыі.

У процівагу гэтым рэакцыйным імкненьням, з самага пачатку гісторыі сучаснага рабочага руху, асабліва-ж з таго часу, як мы ўступілі ў перыяд імпэрыялістычных войнаў і пралетарскіх рэвалюцый, стваралася пралетарскія арганізацыі салідарнасьці і ўзаемадапамогі, мета якіх заключалася ў захаваньні сіл і баяздольнасьці пралетарыяту ў рэвалюцыйнай выключнай барацьбе. Прыпомнім аб тых камітэтах рабочай дапамогі і салідарнасьці, якія стварыў Маркс і Энгельс пры ранейшых клясавых баёх, у 1848 і 1871 г.—пасьля крывавага разгрому Парыскай Камуны. Прыпомнім аб многіх буйных стачках, якія па-рэвалюцыйнаму праводзіліся ранейшай сацыял-дэмакратыяй і ранейшымі свабоднымі прафсаюзамі, пры якіх рашаючую роль адыгрывалі міжнародныя кампаніі па зборы сродкаў і аказаньні дапамогі бастуючым, прадастаўленьне бастуючым бясплатнага памяшканьня і харчаваньня, прыстройваньне іх дзяцей у замежных таварышоў па клясе. Напомнім аб МОПР'ы, які на працягу палага дзесяцігодзьдзя абаранае ахвяр буржуазнай клясавай юстыцыі і дапамагае членам іх сем'яў. Прыпомнім перш за ўсё аб створаным у сувязі з міжнароднай кампаніяй дапамогі Савецкай Расіі ў галодны 1921 г. Міжрабпоме, які з таго часу сыстэматычна разьвівае і ажыцьцяўляе пралетарскую салідарнасьць ў пазьлічонай колькасьці буйных і дробных стачак.

Ужо ў канцы прайшоўшага году Міжрабпом пачаў разгортваць шырокую міжнародную кампанію дапамогі германскаму пралетарыяту, які змагаецца. Ён заклікаў свае мацнейшыя замежныя саюзы да аказаньня матар'яльнай і маральнай дапамогі германскім братом па клясе, лічачы, што германскі пралетарыят займае ў міжнароднай клясовай барацьбе да поўнай ступені вядучае становішча, сьледам за савецкім. Актыўнае праяўленьне міжнароднай пралетарскай дапамогі павінна, па думцы Міжрабпому, мець уплыў на ўзмацненьне рэвалюцыйнай інкцыпытывы і окарацьць шлях, які вядзе да канчатковай перамогі. Далейшае-ж зьбядненьне масаў настолькі пагоршыць агульнае становішча германскага пралетарыяту, што частка яго магла страціць здольнасьць да правядзеньня барацьбы за сваё вызваленьне.

Вялікую ролю ў справе аказаньня міжнародзкай дапамогі адыгрывае сыстэматычная ўзьдзейнасьць на розарвы клясава-сьвядомага пралетарыяту з дробна-буржуазнага і сялянскага лягеру і зблізканьне іх з пралетарскім авангардам, з камуністычнай партыяй. Па сьведчаньні і прызнаньні нават буржуазіі, ніяк

Правяраць, чысьціць партыю павінны толькі летшыя, адданыя сыны партыі

Шлях рэвалюцыянэра

Уся Беларусь ведае і любіць, як аднаго з лепшых сваіх прадстаўнікоў, як цьвёрдага бальшавіка-леніна, тав. В. Ю. ЖАБРОЎСКАГА. Але ніжэй шлях падпольнічыка рэвалюцыянэра, пройдзены тав. Жаброўскім, ня кожны ведае. Таму яго расказ цэнтральнай камісіі па чыстцы беларускай партыйнай арганізацыі, партыйная ячэйка апарату ЦК КП(б) слухае з хвалюючай увагай.

Тав. Жаброўскі нашчадкі дваранства. Бацька прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыі 1905 году, за што быў арыштаваны. Матка пя раз арыштоўвалася і памерла ў 1921 годзе ў Беларускай турме.

Сам тав. Жаброўскі 10-гадовым хлапчуком у 1905 годзе заручаў прокламацыі на пашэнце, каб потым вусна пераказваць іх рабочым. У 1911-13 г. г., працуючы ў коваенскай друкарні, ён пачаў далучацца да сац-дэмакратычнага падполля, пачаў чытаць падпольны сац-дэмакратычны друк, у тым ліку «Праўду». Практычную работу пачаў у 1913 годзе ў с.-д. гуртку с-д. партыі П. і Л, які кіраваўся Я. Богушам і Копесовым.

У 1914 г. пры абяшчэнні вайны тав. Жаброўскі быў арыштаваны. Як толькі выпусьцілі з турмы тав. Жаброўскі палкам адданецца падпольнай партыйнай рабоце. Два гады бязупынная падпольная работы, а ў 1916 — за антываенарыялістычную агітацыю—арыштаваны немцамі. З турмы адпраўлены на прымусовыя работы.

Пабыў на свабодзе кадрэта, але пасьпеў разам з другім бальшавікоў арганізаваць байкот выбараў у літоўскую тарыбу. Быў разьвязным інструктарам-арганізатарам. А летам 1916 г. зноў арыштоўваецца разам з радам іншых таварышоў, у тым ліку Залінным, Грышкялісам, Нарушэвічам. Прапрымалі ў турме месяцы тры.

У часе германскай рэвалюцыі тав. Жаброўскі адзін з арганізатараў першага совецкага сяўету рабочых дакутатаў, ваенна-рэвалюцыйнага камітету, арганізатар партызанскіх атрадаў, кіруе падрыхтоўкай і арганізацыяй паўстаньня ў прасмесьцях Коўна, прымае ўдзел у скліканьні нелегальнай партканферэнцыі ў Коўне на тэрыторыі, занятай нямецкімі акупантамі.

Пасьля ньверскага забойства Карла Лібкнэхта і Росы Люксэмбург амаль уся совецкая арганізацыя бальшавікоў была разгромлена і тав. Жаброўскі, разам з 70-80 такімі-ж самаадданымі рэвалюцыянэрамі Карла і Росы, трапіў у турму. Пасьля вызваленьня з нямецкай турмы пераехаў праз Прагу і працаваў у г. Вільні ў ЦК Літбелу, а потым пры занятасьці Вільні бальшавікамі ў красавіку 1919 году прымаў удзел за ўзброенай абароне гораду ад белапалякаў. Зноў арышт, катаваньні, аддача паляводу суду. Ад сьмерці выратаваў сыны тыфус, бо пасьля таго, як ачуняў, Жаброўскі быў залічан заложнікам і пакінуў Польшчу.

Ледзь пасьпеў перайсьці граніцу для падпольнай работы ў Літве, як быў выдан правакатарам і арыштаваны ў Коўне. Сядзеў разам з т. т. Фрыцкам, Блаўтэнам, Абрамовічам і інш. Вызвалены ў сувязі з адпрыцьцём літоўскага сойму і заключэньнем совецка-літоўскага дагавору.

Амаль бязупынная турэмнае выдзяленьне не падламіла ўпартасьці бальшавіка. Летам 1920 году тав. Жаброўскі — член прэзыдыуму цэнтральнага бюро прафсаюзаў Літвы, старшыня забастовачнага камітету друкароў у перыяд прадзяленьня рэвакуальнай забастоўкі друкароў, потым у Вільні член прэзыдыуму прафесыянальных саюзаў і старшыня культадзелу. У гэтым-жа годзе тав. Жаброўскі адпраўляецца на фронт у Чырвоную армію.

Працуе ў Поарме з начальнікам партыйнай асьветы, нам. начальніка агітпрацы.

Пасьля дэмабілізацыі ЦК РКП(б) пасылае яго на работу старшынёй губпольбюро ў Віцебск. У 1921 годзе паступіў у Сьвердлоўку і адначасова вёў арганізацыйную і прапагандыцкую работу ў Краснапрэсьненскім раёне. Пасьля сканчэньня унівэрсытэту пасланы на кіруючую партыйную работу ў Кіеў, дзе працаваў разам з т. т. Постышавым і Лаўрэнцевым.

З 1928 па 1929 год у Харкаве—адказны інструктар ЦК КП(б)У. На XI зьезьдзе КП(б)У выбіраецца ў ЦК. Пры злучэньні Глухоўскага і Канатопскага округ назначаецца сакратаром аб'яднанага АПК.

З 1930 па люты 1932 г. г.—адказны інструктар ЦК УсеКП(б), потым намесьнік агітпрацы ЦК УсеКП(б). З лютага 1932 году—сакратар ЦК КП(б)Б.

Пытаньняў да тав. Жаброўскага ня было ні ў вусной, ні ў прысутных. На вопта пытаньні? Хіба і так ня ясна, што такому выпрабаванаму, загартаванаму бальшавіку можна даверыць сцяг у чыстцы партыйных радоў?

У бальшавікоў цягі МББ

Гудок. Па адным, па два, групамі запаўняюць бальшавікі і рабочыя слуск бы цягі МББ малую аўдыторыю клюбу імя Ільліча. Сёньня тут правяраецца старшыня ЦСПСБ т. Кавальчук і рабочы ўдарнік, машыніст тав. Каланіцкі, якія намечаны ў праверкомы на чыстцы партыйных радоў.

Поўная аўдыторыя, заняты прахоры, тоўпяцца ля дзьвярэй калідору, занята частка бібліятэкі. Бальшавікі парткалектыву цягі, разам з рабочымі беспартыйнымі масамі прышлі на чыстку, прышлі дапамагчы партыі выбраць у праверкомы нашых, адданейшых камуністаў, праверанных загартаваных бальшавікоў. Прышло таля 200 чалавек.

На праверцы член бюро ПК КП(б)Б —старшыня ЦСПСБ тав. Кавальчук.

Сын селяніна, батрак, 18-ці гадоў паехаў у Амэрыку. На работу трапіў не адразу. Два месяцы т. Кавальчук быў беспрацоўным. Нарэшце на работу ў сталяліцейны чорнарабочым у штаце Пэнсыльванія. Потым штат Мічыгэн. Форд'аўскі заводы. Чорнарабочы. Ліцейшчык.

У 1916 годзе ўступае ў расійскую фэдэрацыю амэрыканскай сацыялістычнай партыі. Расійская фэдэрацыя—левае крыло. Гэта ява ў значнай ацэнцы пацрыхтавала расколу ў сацыялістычнай партыі і была адным з арганізатараў кампартыі ПАША. Тав. Кавальчук пераходзіць у кампартыю. Ён сакратар ячэйкі заводу. Налёт на кампартыю. Арышт. Пад арыштам 5 месяцаў. Пасьля—высылка ў СССР.

1920 год. У СССР—адразу ў кіпучую барацьбу за адбудаваньне народнай гаспадаркі. На завод «Русобалка», потым на «АМО». ВЧК. Вучоба. Бязупынная партыйная работа—ад вол-партарганізатара, памятоўга кантрольчыка да члена МК, сакратара аршанскага АК КП(б)Б, сакратара Менгаркому і старшыні ЦСПСБ.

— Вось і ўсё,— канчае тав. Кавальчук.

— А ў ячэйцы як працуеш?—просіць даклаўніць свой расказ старшыня праверкому тав. Лычоў.

І прыходзіцца тав. Кавальчуку прызнаць:

— Шчыра гаворачы—слабы прымаю ўдзел у ячэйцы, мала бываю, асабліва ў апошні час, пасьля пераходу з Менгаркому ў ЦСПСБ.

Каля 20 адказаў на пытаньні, заданыя з месц і камісіяй па чыстцы, паказалі тавр Кавальчука, адданага бальшавіка, вартага быць у праверачнай камісіі. І яна, чаму ў спрэчках рабіўся акцэнт менна на гэта. Бальшавік чулы да патроб рабочае клясы. Гэтага патрабуе партыя. Дэталь: тав. Сярок напаўнае сходу, як пры непасрэднай практычнай дапамозе тады сакратара Менгаркому т. Кавальчука ўдалося зруйнаваць руціну бюракратызму і штурхнуць уперад справу пабудовы 112-кватэрнага дому чыгуначнікаў. Але той-жа Сярок падкрэсьліў невыстарчальную сувязь тав. Кавальчука са сваёй ячэйкай.

І далі, падагульняючы вынікі і адзначэньні гэты істотны недахоп, недахоп які ў парадку бальшавіцкай самакрытыкі правільна падмецілі бальшавікі цягі, тав. Лычоў ставіць пытаньне, ці можа застацца ў партыі і быць у праверкоме тав. Кавальчук,—сход дружна адказаў: «Можа».

* * *

Рабочы машыніст, лепшы ўдарнік, член партыі з верасьня 1917 году тав. Каланіцкі на праверцы.

З селяніна сям'і. Пастушок. Пакаў на тыцьвіну, дзе працуе і зараз. Па рабоце—ўпарадзе. Шлях па вымаральніках перавыконвае. Прыклад для іншых. «Варты член камісіі па чыстцы, можна чыстку даверыць»—такая агінадушная думка і членаў камісіі т. т. Лычова і Сьвярдлоўай, і сходу камуністаў, і рабочых цягі.

Л. М.

УДЗЕЛЬНІКІ НАРАДЫ СТАРШЫНЬ РАЙКАМІСІЙ ПА ЧЫСТЦЫ

СПРАВА НАЛЕВА (ніжні рад) т. т. ПРУСАКОВА Е. К. — старшыня асьвейскай райкамісіі па чыстцы; БУРАЧЭЎСКІ П. П. — старшыня дрысенскай райкамісіі; РЫСКІН А. Б. — старшыня менскай камісіі па чыстцы; САХАРАВА — член рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б; ЦЫНІТ П. П. — старшыня турэўскай райкамісіі; РЫНК В. І.—старшыня плешчаніцкай райкамісіі; ТУРЛАЙ А. А.— старшыня аршанскай райкамісіі; ЛЬЧОЎ — член рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б.

ВЕРХНІ РАД т. т. ЗЛКСНЭ—старшыня полацкай райкамісіі па чыстцы; ЛУК'ЯНАЎ І. В. — старшыня капыльскай райкамісіі; БЭРЭНЗОН Р. Б. — старшыня заслаўскай райкамісіі; ЛУК'ЯНЧЫК І. К. — старшыня вушацкай райкамісіі; ЧЭЧЫН А. П. — старшыня лагойскай райкамісіі; ЛЯЎКОЎ М. А. — старшыня мазырскай райкамісіі; ПЯТРУКОВІЧ В. Д. — старшыня барысаўскай райкамісіі; ЖУКОВІЧ І. Ф. — старшыня бабруйскай райкамісіі; СКАЎРОНАК К. Т. — член рэчыцкай райкамісіі па чыстцы.

АБ СКЛАДЗЕ РАЁННЫХ КАМІСІЙ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б ад 2-VI 1933 г.

Назначыць раённыя камісіі па чыстцы партыі ў складзе наступных таварышоў:

АСЬВЕЙСКІ:

Старшыня — ПРУСАКОВА Е. К., член партыі з 1919 г., член ЦКК КП(б)Б, заг. бюро сакрэтар ЦКК-НК РСІ БССР.

Члены: БАГДАНСКІ Р. А.—член партыі з 1919 г., работнік вышэйшай сельска-гаспадарчай камуністычнай школы БССР.

МІХЕЛЬСОН Э. Я. — член партыі з 1917 г., работнік Галоўнага кіраўніцтва міліцыі.

ДРЫСЕНСКІ

Старшыня — БУРАЧЭЎСКІ П. П., член партыі з 1918 г., кіраўнік справамі ЦК КП(б)Б.

Члены: РОЗЭНБЭРГ З. Х. — член партыі з 1921 г., член ЦКК КП(б)Б, рабочы заводу «Бальшавік».

ДЗЕЙКА І. І. — член партыі з 1918 г., старшыня Дрысенскай РКК КП(б)Б.

ВУШАЦКІ:

Старшыня — ЛУК'ЯНЧЫК І. К., член партыі з 1920 г., работнік ПП АДПУ па БССР. Члены СЬЦЯПНЯК Н. М.—член партыі з 1919 г., член ЦКК КП(б)Б, член парткалегіі ЦКК КП(б)Б.

БЭРЗІН А. Я. — член партыі з 1921 г., старшыня Вушацкай РКК КП(б)Б.

БЯГОМАЛЬСКІ:

Старшыня — ПІККІС Б. М., член партыі з 1917 г., работнік НКЮ БССР.

Члены: КЛЯБАНАЎ Н. М.—член партыі з 1919 г., старшыня ЦП саюзу РГУ.

ПЯТРЫКЕВІЧ — член партыі з 1919 г., старшыня Бягомльскай РКК КП(б)Б.

ДЗЯРЖЫНСКІ:

Старшыня — КЛІМКОВІЧ М. Н., член партыі з 1920 г., член рэвіз. камісіі ЦК КП(б)Б, старшыня аргбюро пісьменьнікаў.

Члены: ЛІЎШЫЦ Л. М. — член партыі з 1920 г., намесьнік дырэктара заводу «Бальшавік».

КУРКЕВІЧ С. Я. — член партыі з 1917 г., старшыня Дзяржынскай РКК КП(б)Б.

ПЛЕШЧАНІЦКІ:

Старшыня — РЫНГ В. І., член партыі з 1917 г., работнік ПП АДПУ па БССР.

Члены: ВАЛАХНЯНСКІ Н. Г. — член партыі з 1924 г., член ЦК КП(б)Б, нам. дырэктара заводу імя Варашылава.

КАНДРАТ Я. М. — член партыі з 1917 г., член ЦКК КП(б)Б, старшыня Плешчаніцкай РКК КП(б)Б.

ВУЗЬДЗЕНСКІ

Старшыня — СЯНКЕВІЧ А. В., член партыі з 1919 г., кіраўнік прамысловай групы ЦКК-НК РСІ Бел.

Члены: КРАЙКО Н. Л. — член партыі з 1924 г., рабочы заводу імя Варашылава.

САРОЧІН Б. В. — член партыі з 1924 г., старшыня Вузьдзенскай РКК КП(б)Б.

ЖЫТКАВІЦКІ:

Старшыня—АВЕРЫН М. І., член партыі з 1920 г., член ЦКК КП(б)Б. нам. наркома РСІ БССР.

Члены: ЯКУШЭВІЧ Г. Е. — член партыі з 1925 г., рабочы заводу імя Ланцуцкага.

ПАНКРАТАЎ Г. І. — член партыі з 1919 г., старшыня Жытковіцкай РКК КП(б)Б.

ЛАГОЙСКІ:

Старшыня — ЧЭЧЫН А. П., член партыі з 1919 г., работнік ПП АДПУ па БССР.

Члены: ЦЫЛЬКЕ А. А., член партыі з 1920 г., інструктар ФЗВ станцыі Менск.

КРУПІЦА А. В. — член партыі з 1919 г., старшыня Лагойскай РКК КП(б)Б.

ТАЛАЧЫНСКІ:

Старшыня — ЛАЗОЎСКІ Ф. Н., член партыі з 1918 г., нам. Наркамзему БССР.

Члены: КАЛАНІЦКІ Т. Н. — член партыі з 1917 г., машыніст ст. Менск, МББ чыг.

ДЫНАРШТЭЙН Б. З.—член партыі з 1920 г., старшыня Талачынскай РКК КП(б)Б.

ЗАСЛАЎСКІ:

Старшыня — БЕРАНЗОН Р. Б., член партыі з 1920 г., работнік ПП АДПУ па БССР.

Члены: ЗЯБКІН П. П. — член партыі з 1917 г., член ЦКК КП(б)Б, член парткалегіі ЦКК КП(б)Б.

ЖАРКЕВІЧ — член партыі з 1918 г., старшыня Заслаўскай РКК КП(б)Б.

ГОРАЦКІ:

Старшыня — АЎЧЫНЬНІКАЎ Г. Г., член партыі з 1919 г., рэктар Вышэйшай сельска-гаспадарчай камуністычнай школы БССР.

Члены: ВАЛЬФСОН — член партыі з 1919 г., работнік Горацкага райаддзяленьня ДПУ.

СІДАРАЎ Д. Г. — член партыі з 1920 г., старшыня Горацкай РК КП(б)Б.

КАПЫЛЬСКІ:

Старшыня — ЛУК'ЯНАЎ І. В., член партыі з 1917 г., работнік ПП АДПУ па БССР.

Члены: ВАРОНІЧАЎ С. М. — член партыі з 1917 г., міжраённы арбітр СНК БССР.

ХАЙТОВІЧ М. І. — член партыі з 1918 г., старшыня Капыльскай РКК КП(б)Б, член ЦКК КП(б)Б.

СУРАСКІ

Старшыня — ГРЫЦКЕВІЧ П. Н., член партыі з 1920 г., загадчык культмасавым аддзелам ЦСПСБ.

Члены: БУТЫЛЕЎ Я. В. — член партыі з 1924 г., рабочы фабрыкі «Кастрычнік».

ЛЮБІМАЎ К. М. — член партыі з 1919 г., член ЦКК КП(б)Б, старшыня Сураскай РКК КП(б)Б.

ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ:

Старшыня — ГАЎБШТЭЙН Ю. Г., член партыі з 1919 г., работнік ПП АДПУ па БССР.

Члены: СЕРПЕНЬ А. К. — член партыі з 1908 г., член ЦКК КП(б)Б, член парткалегіі ЦКК КП(б)Б.

КІРУШЧАНКА Я. Ф. — член партыі з 1919 г., старшыня Чырвона-Слабодзкай РКК КП(б)Б.

ЖЛОБІНСКІ:

Старшыня — ЭГЛЕ Р. Я., член партыі з 1912 г., член ЦКК КП(б)Б, упаўнаважаны НКШЗ пры СНК БССР.

Члены: МАНЮК А. П. — член партыі з 1925 г., рабочы заводу імя Ланцуцкага.

ФЕДАРЫНЧЫК — член партыі з 1918 г., член ЦКК КП(б)Б, старшыня Жлобінскай РКК КП(б)Б.

ТУРАЎСКІ:

Старшыня — ЦЫНІТ П. П., член партыі з 1917 г., член ЦКК КП(б)Б, работнік ПП АДПУ па БССР.

Члены: КУЛІНКОВІЧ Н. Н. — член партыі з 1924 г., асьпірант істпарту.

ЦЫПОРКІН А. З. — член партыі з 1925 г., старшыня Тураўскай РКК КП(б)Б.

РАСОНСКІ:

Старшыня — САКАЛЕНКА А. А., член партыі з 1917 г., кандыдат у члены ЦК КП(б)Б, нам. упаўнаважанага НКЦяжпрому пры СНК БССР.

Члены: ШАКАЛАЎ П. А. — член партыі з 1918 г., загадчык сэктарам аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б.

ШАРАНОС А. С. — член партыі з 1924 г., старшыня Расонскай РКК КП(б)Б.

ВЕТКАЎСКІ:

Старшыня — ЦЫУНЧЫК К. С., член партыі з 1920 г., работнік гомельскага райаддзяленьня ДПУ.

Члены: КАЗАКЕВІЧ С. Б. — член партыі з 1920 г., рабочы Палесдруку ў Гомелі.

МАЛЬШАВА — член партыі з 1924 г., член ЦКК КП(б)Б, работніца фабрыкі «Взорвы».

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

БАЛЬШАВІК-БАЕЦ

У гэты дзень перад сходам, прысьвечаным праверцы сакратара ЦК КП(б)Б тав. Рыскіна, зірнула з глыбіні гісторыі нашай партыі бывая старонка жыцьця і барацьбы аднаго з рэвалюцыянэраў-бальшавікоў.

Нельга гаварыць аб гэтай біяграфіі, не ўспамінаючы бляных старонак жыцьця ўсёй нашай партыі, не ўспамінаючы аб франтох грамадзянскай вайны, аб будаўніцтве сацыялізму, аб непрымірымай барацьбе з ворагамі і адхіленнямі партыі.

Тав. Рыскін за свае 35 год прайшоў гераічны шлях барацьбы ад хлапчука-краўца да сакратара Центральнага Камітету Камуністычнай партыі Беларусі.

Яшчэ ў 1915 годзе, будучы краўцом у Юзаўцы, ён арганізоўваў і кіраваў на бастоўкай краўцоў. У гэтай барацьбе ён атрымаў першае крышчэньне бальшавіка-байца. Актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, арганізатар партызанскага атраду Рагачоўшчыны тав. Рыскін захаваў у сабе якасьць бальшавіка-байца і будучы на партыйнай савецкай рабоце ў Магілеве, Гомелі, Віцебску, у Кара-Бардынскім аўтаномным краі, будучы сакратаром ЦК КП(б)Б.

Проста і досыць окупа гаварыў тав. Рыскін аб сабе. Гэта прывычка, выпрацаваная ў падпольлі, на фронце ёсьць тая скромнасьць, якая зьяўляецца неадрыўнай рысай кожнага бальшавіка.

На сходзе, дзе праходзіў праверку тав. Рыскін, камуністы і рабочыя фабрыкі «Чырвоная зорка» шмат чаго дадалі да яго біяграфіі.

Тав. Рыскін расказаў рабочым аб тым, як партыя змагаецца зараз за паляпшэньне матар'яльнага забесьпячэньня рабочых, якую працу ён сам праводзіў і праводзіць у гэтым напрамку. Ён на прыкладзе двух гомельскіх заводаў (імя Ланцуцкага і дрэвапрацоўчага камбінату) паказаў, як колькі рабочае забесьпячэньне залежыць, галоўным чынам, ад трыкутніка прадпрыемстваў.

— У гэтым годзе,—казаў тав. Рыскін,—сяўба праходзіць лепш, чым у мінулым. І калі будзе праведзена добра праполка і ўборка, прыгарадныя гаспадаркі амогуць на 50 проц. забясьпечыць рабочых бульбай.

У заключэньне тав. Рыскін даў развернуты адказ на запытаньне старшыні цэнтральнай праверачнай камісіі тав. Анціпава аб яго ўдзеле ў барацьбе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. У гэтай барацьбе тав. Рыскін прымаў актыўны ўдзел. Будучы ў той час сакратаром парткалегіі ЦКК, праз яго рукі прайшло 50 спраў беларускіх нацдэмакратаў, якія прабраліся ў партыю з мэтай контр-рэвалюцыйнай работы. Непрымірымасьць, бязьлітасная барацьба з малейшымі ўхілам ад генэральнай лініі партыі — вось характэрная рысэ бальшавіка Рыскіна.

Будучы сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Рыскін меў шчыльную сувязь з рабочым калектывам фабрыкі. Аб гэтым расказаў сакратар партыйнай ячэйкі фабрыкі. Гэту ацэнку падтрымаў увесь сход.

— Тав. Рыскін—адзін з лепшых бальшавікоў, стойкіх барацьбітоў за генэральную лінію нашай партыі. Яго—просты абавязак праводзіць такую адказную ганаровую работу, як чыстка радоў партыі ад чужых, прымазаўшыхся, няўстойлівых элемэнтаў.

Ад Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы ячэек КП(б)Б па гор. Менску

Абяшчаецца склад праверачных камісій для ніжэйнаступных груп ячэек: старшыні камісій зацьверджаны рэспубліканскай камісіяй па чыстцы КП(б)Б і члены праверачных камісій зацьверджаны Менскай гарадзкой камісіяй па чыстцы.

СКЛАД КАМІСІІ	ПРАХОДЗЯЦЬ ЧЫСТКУ ЯЧ. КП(б)Б
Старшыня ХАДАСЭВІЧ П. І., член партыі з 1921 году, член ЦКК КП(б)Б, старшыня Менскай гарадзкой Кантрольнай Камісіі КП(б)Б.	
Члены: ЗЭЙФМАН Б. П., член партыі з 1925 году. Інструктар агітмасавага аддзелу гаркому КП(б)Б.	
РАГІНСКІ В. Я., член партыі з 1917 году, нам. упаўнаважанага Камзагу СССР па БССР і кіраўнік дэлярж. інспэкцыі.	
Старшыня БЛОЎШТЭЙН З. М., член партыі з 1917 году, член ПК і ЦКК КП(б)Б. Сакратар парткалегіі МенгаркК КП(б)Б.	Зав. «Бальшавік», абутковая ф-ка, фабрыка «Ўсход», абутков. майст. Саюзскур, Уцільскур, Наркамлегпрам, абутков. скур. тр.
Члены: ВЕНЖЫК Г. І., член партыі з 1896 году, работнік упаўнаважанага Наркамсувязі.	
ПАСТУХОВІЧ З. В., член партыі з 1925 году, інструктар-сьлесар заводу імя Мясьнікова.	
Старшыня ДЗЯНІСКЕВІЧ Н. М., член партыі з 1921 году, загадчык аддзелам кадраў ЦК КП(б)Б.	Фабрыка «Кастрычнік», фабрыка «8 сакавіка», кушнерная фабрыка, фабрыка імя Крупскай, «Чырв. тэкстыльшчык», школа «КІМ», Белшвэйтрэст, Белшвэйзбыт.
Члены: КАПЛАН Л. Б., член партыі з 1920 году. Начальнік сэктару арганізац. працы Галоўдартрансу.	
РУСАНОВІЧ М. Я., член партыі з 1925 году. Заг. аддз. рацыяналізац. Наркамлегпраму.	
Старшыня — ЛІСКОВІЧ М. І., член партыі з 1917 году, кандыдат у члены ЦК КП(б)Б. Адказны сакратар ЦСПСБ.	Паравознае дэпо, зав. імя Мясьнікова, вагоннае дэпо, служба эксплёатацыі дыстан. шляху, 2-гі чыг. буд. вуч., ТПО, Пажар. ахова чыг.
Члены: ЗАВЯЛАЎ С. М., член партыі з 1919 году. Дырэктар заводу «Мапочных кіслот».	
МЕЛЬНІКАЎ М. П., член партыі з 1919 году. Адказны сакратар ЦП саюзу металістаў працы.	
Старшыня — ГУРЭВІЧ Н. Г., член партыі з 1920 году, член ЦКК КП(б)Б, наркам Снабжэньня БССР.	Зав. імя Молатава, шчотачная фабрыка, шчаўнная фабрыка, пямцавая фабрыка, Замеканпаль, Торгсін, Белуціль, Лесбап, Лесазбыт, Белдарэў, Папертрэст, Бел хімлес, Упаўнаркамлес.
Члены: ВАСІЛЬЛЕЎ І. П., член КП(б)Б з 1917 году. Начальнік адм. гаспадарчага сэктару Упаўнаркамлесу.	
КРУК С. П., член партыі з 1925 году. Электраманцёр вагоннага дэпо, ст. Менск.	
Старшыня — ЧЫЖОВА Н. Е., член партыі з 1919 году. Рэдактар КІЖ'а.	Хэмфармзавод, Аптэкаміраўніцтва, Наркамздраў, Цэнтральн. паліклін., 1-я больніца, 2-я больніца, МТПД, Ахматмпад, курсы, Белмэтэлаб'яд., дзіцячая клініка,мэд. інстытут, мэд. тэхнікум, Чырвоны крыж, Дзінфон, курсы тэхнікуму, курсы чырв. дырэктароў, цэнтральн. радзільн. дом, тубінстытут.
Члены: РАКСІН Х. Л., член партыі з 1924 году. Загадчык кадраў фабрыкі імя 8 сакавіка.	
УВАРАЎ-УБОРАЎ В. К., член партыі з 1919 году. Член ПК МенгаркК КП(б)Б.	
Старшыня — СТАРАВОЙТАЎ П. П., член партыі з 1919 году, член МенгаркК КП(б)Б. Работнік істпарту.	Друкарня імя Сталіна, шпалерная фабрыка, фабрыка «Беларуская», гута, чырвоны хэмік, хэм. інстытут.
Члены: ШНІТМАН Н. В., член партыі з 1924 году. Загадчык складу абутковай фабрыкі.	
БАБУЛЯК, член партыі з 1919 году. Дырэктар рабочай паліклінікі.	
Старшыня — ГАРАГЛЯД І. Н., член партыі з 1917 году, старшыня ЦП саюзу торфаспаншчарай прамысловасьці.	Фабрыка «Камунарка», Хлебазавод, Мясакамбінат, сьпіртазавод, зав. «Беларусь», зав. «Пралетары», зав. «Чырв. Зорка», зав. «Малочных кіслот», малочны завод, трыкотаж харчавікоў, інстытут харч. прамысл., Белмяса, БЕЛКМО, сталёўка МГРК № 1, тэхнік. брадзільн. раб., сэкцыя грамадзк. харч.
Члены ЛІЎШЫЦ Л. М., член партыі з 1920 году. Нам. дырэктара заводу «Бальшавік».	
ПАЖЫВІЛКА А. А., член партыі з 1920 году, член гаркому КП(б)Б, дырэктар заводу «Камунар».	

Чыстка па вышэйпаказаных ячэйках і калектывах пачынаецца з 5 чэрвеня.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ КП(б)Б ПА ЧЫСТЦЫ.

Тарфянікі, ад вас залежыць пералом у рабоце

У народна-гаспадарчым пляне 1933 году за тарфяной прамысловасьцю БССР запісана звыш 1.500 тысяч тон торфу.

У гэтым годзе, як ніколі, склаліся ўсе спрыяючыя аб'ектыўныя магчымасьці, на якіх так часта спасылаюцца нашы гаспадарнікі, для пасьпяховага разгортваньня торфаздабычы і поўнага выкананьня гадавога пляну. Спачатку сезону было завербавана рабочых на 26 проц. больш пляну. Уліліся новыя інжынэрна-тэхнічныя сілы ў тарфяную прамысловасьць. Шпарка механізуюцца вытворчыя працэсы. Асигнавана значная сума капіталаўкладаньняў у 1933 годзе ў тарфяную прамысловасьць, як важнейшую галіну індустрыі БССР.

Усё гэта і спрыяючае надвор'е (рань няя вясна) давалі поўную магчымасьць арганізацыям тарфяной прамысловасьці спарадуць па-баявому разгарнуць бальшавіцкія тэмпы торфаздабычы ў сезоне 1933 году. Некаторыя перадавыя торфаводы прыступілі да працы раней плянавага тэрміну. Ужо 5 мая 9 загоняў сыстэмы Белторфу далі краіне 2.676 тон торфу.

Але тэмпы разгортваньня торфаздабычы ня сёньняшні дзень яўна нездавальняючыя. Тарфяная прамысловасьць БССР ідзе ў выконаньні сваёй праграмы з пагражаючымі прарывамі.

Белторф—кіруючае аб'яднаньне торфапрамысловасьці—ўсім марудна разгортвае тэмпы торфаздабычы. Яго галавая праграма ў 1933 годзе—493 тыс. тон тарфяного апалу. Плянам прадугледжаны нарастаючы тэмп з дня ў дзень, з месяца ў месяц з такім разьлікам, каб выканаць гадавую праграму.

Але тэмпы гэтага — недахват абедаў і нізкая якасьць іх. Характэрным фактам бюракратычных адносін да справы забесьпячэньня рабочых зьяўляецца тое, што на заводзе «Бальшавік» рабочыя прымушаны карыстацца для піцьця балотнай вадой толькі таму, што кіраўніцтва заводу ня здолела знайсьці бочкі.

У выніку ўсяго гэтага назіраецца вялікая цякучасьць рабочай сілы.

Ператварыць сталовую ва ўзорны цэх заводу, забясьпечыць жыляёным памяшканьнем усіх рабочых, «штодзенна клапаціцца аб паляпшэньні культурна-бытавога і матар'яльнага становішча рабочых» (Кагановіч)—галавы задачы арганізацый тарфяной прамысловасьці.

Час гарачы. Вучастак работы адказны. Ёсьць поўная магчымасьць навярстаць прапушчанае і ўзмацніць тэмпы работы тарфяной прамысловасьці. Для гэтага патрэбна а бальшавіцкім запалам змагацца за кожную цагліну, за кожную тону торфу.

АПОШНЯЯ ПАСТАНОВА СНК СССР І ЦК УсеКП(б) аб кіраўніцтве на шахтах і прамова т. ГІКАЛО на нарадзе тарфянікаў, скліканай ЦК КП(б)Б, — простыя шляхі для ажыцьцяўленьня важнейшых задач на рабоце тарфяной прамысловасьці.

Кожны камуніст у першую чаргу, камсамолец і беспартыйны рабочы-тарфяніц, павінен зразумець, што краіне Саветаў патрэбна кожная тона торфу, запрактаваная ў пляне. Ад выкананьня прамфінпляну тарфяной прамысловасьці ў значнай ступені залежыць выканаць гадавы плян.

Ніжэйшую ступень вытворчасьці, у кар'ер, у брыгаду, мабілізаваць масы тарфянікаў на выкананьне заданьня, на ўмацаваньне пралетарскай дысцыпліны, даючы рашучы адпор спробам клясавага ворага, рэакцыі і адыграў падарваць устої сацыялістычнай дысцыпліны працы і сарваць прамфінплян важнейшай галіны індустрыі—простыя абавязкі гэтых арганізатараў.

Клясавы вораг разумее ўсё значэньне торфаздабычы для сацыялістычнай прамысловасьці. Ён знаходзіць сабе прытулак на торфаводах, пралазіць на адказныя вучасткі вытворчасьці і праводзіць там сваю шкодніцкую дзейнасьць. На заводзе «Чырвоны сьцяг» цьвёрдазадзеньнікі браты Кулікавы (брыгада Лужаковай) доўгі час сабатавалі работу (на перастаноўці машыны трацілі 2 гадзіны замест 10-15 мінут, якія фактычна былі патрэбны для гэтага), яны проста гаварылі рабочым, што прышлі на завод не працаваць, а перашкаджаць. На заводзе «Шлях сацыялізму» кулакі і зараз яшчэ займаюць адказьнейшыя вучасткі работы, а некаторыя з іх нават пралезьлі ў партыю (Сідаранка). Усё гэта гаворыць аб вэльмі старчальнай пільнасьці партыйных і прафсаюзных арганізацый торфаводу.

Узьняць палітычную актыўнасьць мас тарфянікаў, накіраваць ярасьць мас на барацьбу з клясавым ворагам, з яго спробамі сарваць выкананьне прамфінпляну—важнейшая задача арганізацый тарфяной прамысловасьці.

Грамадзкае харчаваньне на радзе заводаў пастаўлена ўсёю дрэнна. Тарфяныя ня здолелі разгарнуць як сьлед тэмпаў загатоўкі неабходных прадуктаў. Вельмі часты выпадкі, калі рабочыя тарфяному займаюцца самазабесьпячэньнем, ператвараюцца ў ня-рабочых і ня выконваюць і ня выконваюць.

Гэтыя, [illegible] організацыямі — першачарговая задача заводзкіх арганізацый.

Стаць на ніжэйшую ступень вытворчасьці, у кар'ер, у брыгаду, мабілізаваць масы тарфянікаў на выкананьне заданьня, на ўмацаваньне пралетарскай дысцыпліны, даючы рашучы адпор спробам клясавага ворага, рэакцыі і адыграў падарваць устої сацыялістычнай дысцыпліны працы і сарваць прамфінплян важнейшай галіны індустрыі—простыя абавязкі гэтых арганізатараў.

Клясавы вораг разумее ўсё значэньне торфаздабычы для сацыялістычнай прамысловасьці. Ён знаходзіць сабе прытулак на торфаводах, пралазіць на адказныя вучасткі вытворчасьці і праводзіць там сваю шкодніцкую дзейнасьць. На заводзе «Чырвоны сьцяг» цьвёрдазадзеньнікі браты Кулікавы (брыгада Лужаковай) доўгі час сабатавалі работу (на перастаноўці машыны трацілі 2 гадзіны замест 10-15 мінут, якія фактычна былі патрэбны для гэтага), яны проста гаварылі рабочым, што прышлі на завод не працаваць, а перашкаджаць. На заводзе «Шлях сацыялізму» кулакі і зараз яшчэ займаюць адказьнейшыя вучасткі работы, а некаторыя з іх нават пралезьлі ў партыю (Сідаранка). Усё гэта гаворыць аб вэльмі старчальнай пільнасьці партыйных і прафсаюзных арганізацый торфаводу.

Узьняць палітычную актыўнасьць мас тарфянікаў, накіраваць ярасьць мас на барацьбу з клясавым ворагам, з яго спробамі сарваць выкананьне прамфінпляну—важнейшая задача арганізацый тарфяной прамысловасьці.

Грамадзкае харчаваньне на радзе заводаў пастаўлена ўсёю дрэнна. Тарфяныя ня здолелі разгарнуць як сьлед тэмпаў загатоўкі неабходных прадуктаў. Вельмі часты выпадкі, калі рабочыя тарфяному займаюцца самазабесьпяч

ШАЛЕНСТВА ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМУ

Сьмяротны прысуд над 4 рабочымі

АЛЬТОНА, 2 (Белта). Суд па справе рабочых, якія абвінавачваюцца ва ўдзеле ў крывавых сутычках 17-га ліпеня 1932 году, прыгаварыў чатырох да кары сьмерцю, 6—да катаржных работ на тэрміны 3½ — 10 год. Рэшта апраўдана.

***

БЭРЛІН, 2 (Белта). Першага чэрвеня ў Бэрліне зробіен рад вобыскаў асоб, якія падазраюцца ў камуністычнай дзейнасьці. Двох арыштавалі. Як паведамляе «Фольксцэйтунг», у лесе каля гораду Кастроп-Роксэля паліцыя выявіла камуністычны сход, у якім прымала ўдзел каля 60 чалавек. Арыштавана толькі некалькі чалавек, асатальныя скрыліся.

Актысавецкі выпад германскай паліцыі

БЭРЛІН, 2 (Белта). Першага чэрвеня каля 11 гадзін ночы паліцэйскія, разка пазваніўшы ў кватэру кіраўніка гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Гамбургу тав. Бальнскага, у якога знаходзіліся нам. наркома замежнага гандлю тав. Фрумкін, нам. гандлёвага прадстаўніка СССР у Германіі тав. Фрыдрыхсон і генэральны консул СССР у Гамбургу тав. Крумін, патрабавалі, каб былі адчынены дзьверы і каб іх упускалі для вобыску, нясумненна ведаючы, што яны зьявіліся на кватэру афіцыяльнага прадстаўніка СССР, які мае дыпляматычны пашпарт. Паліцэйскім было ўказана на тое, што ўсе 4 асобы ў кватэры маюць дыпляматычны пашпарты. Паліцэйскія, аднак, прабавалі ўварвацца ў кватэру. Тольки рашучая заява генконсула тав. Крумінa, што ён патрабуе неадкладнага выклику паліцэйпрэзыдэнта і што ён да яго прыбыцьця ня ўпусьціць паліцэйскіх, прымусіла іх адыйсьці. Генэральны консул СССР накіраваў гамбургскаму сэнату ноту пратэсту.

Гітлер у Лёнданскім музэі

Лёнданскі музэй васковых фігур мадам Туссан папоўнен новым экспанатам фігурай Гітлера, якую наведвальнікі музэю замазалі чырвонай фарбай і замацавалі табліцай з надпісам: «Гітлер—масавы забойца».

НА ЗДЫМКУ—момант перавозкі фігуры Гітлера ў суд, дзе яна будзе служыць у якасьці «рэчавага доказу».

Белабандыты ў радох фашысцкіх штурмавікоў

ПАРЫЖ, 2 (Белта). Базельская газэта «Нацыянал-цэйтунг» апублікавала сьпіс белагвардэйцаў, якія заявілі, што яны—прыхільнікі нацыяналсацыялізму. У сьпісе—генэрал Сахараў, палкоўнік Весялоў, Гуманскі, Мясаедаў, Табарыйскі, сакратар т-ва «Русская Правда» Тальбэрг, рэдактар часопісі «Набат»—Якаўлеў, палкоўнік Палтавец-Остраніца. Паводле слоў газэты, Роззенбэрг—пасрэднік паміж імі і Гітлерам. У Германіі белагвардэйцы ўзмацнілі работу. У Бэрліне іх сход урачыста заявіў аб далучэньні да нацыянал-сацыялізму.

Зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню шырокіх працоўных мас

БЭРЛІН, 2 (Белта). Паводле даных статыстычнага кіраўніцтва індэкс пражытачнага мінімуму Германіі складаў у маі—118,2, супроць 116,6 у красавіку, што тлумачыцца падарожаньнем прадуктаў харчаваньня.

Паводле даных аб выніках 1932-33 бюджэтнага году, даход склаў 6.647 млн. марак, супроць 7.790 млн. папярэдняга году.

***

«Правда», камэнтуючы шырока раздуваемы германскімі фашысцкімі дэмагогамі новы закон аб вопыту мільярду марак для арганізацыі грамадзкіх работ з мэтаю зьмяншэньня беспрацоўя, піша: «сам па сабе плян фашысцкіх выратоўцаў германскага капіталізму нічога супольнага ня мае з праблемай беднасьці беспрацоўных і прасьледуе мэты зусім не гаспадарчага парадку. Увагі заслугоўвае асьцярожнае мільярду марак на ажыцьцяўленьне плану. Адкуль фашысты возьмуць гэты мільярд? У павуку ніхто не дасьць ні пфэнінга. Падаткі ня могуць даць такой калёсальнай сумы. Астаецца другарскі варыянт, які і без таго досыць шырока скарыстоўваецца зараз фашысцкай дыктатурай. Інфляцыя, г. зн. узмацненьне эксплёатацыі, галечы, аграбленьне мас—вось лёгічны вынік фашысцкага «адраджэньня» Германіі».

Германія стараецца зьнізіць курс аўстрыйскіх грошай

ВЕНА, 3 (Белта). Па паведамленьні ўрадавай «Рэйхспост», у апошнія дні праз аўстра-германскую граніцу кантрабандай на аўтамабілях перавезена шмат папяровых шылінгаў, якія скарыстоўваюцца Германіяй для зьніжэньня аўстрыйскай валюты на замежных біржах. Выдача візаў для паездкі ў Германію амаль спынілася. Улады італьянскіх правінцый давалі да ведама італьянскага ўраду, што закрыцьцё Германіяй аўстра-германскай граніцы закранае інтарэсы Італіі і тармозіць турызм. Італьянскі ўрад абяцаў прыняць меры.

У Вене кожны дзень праводзяцца масавыя вобыскі на кватэрах нац. сацыялістаў. Канфіскуюцца вялікія партыі зброі і літаратуры. 2 чэрвеня канфіскован орган аўстрыйскіх нац. сацыялістаў «Дэйчэ Эстрэйхішэ Цэйтунг».

Папярэдняя цэнзура для аўстрыйскай „Ротэ Фанэ"

ВЕНА, 2 (Белта). Зноў выйшаў орган Аўстрыйскай кампартыі «Ротэ Фанэ». Газэта выходзіць з папярэдняй цэнзурай. У кніжным магазыне кампартыі Аўстрыі зроблен вобыск. Канфіскавана 3 тысячы кніг і 3500 брашур.

Аўстрыйскі урад забараніў уезд германскіх грамадзян

ВЕНА, 2 (Белта). На пасяджэньні савету міністраў пастаноўлена адказаць на забарону Германіяй уезду турыстаў з Аўстрыі аналёгічным рэжымам у адносінах германскіх грамадзян, якія хадайнічаюць аб уезьдзе ў Аўстрыю. Каб кампенсаваць страты ад апошніх распараджэньняў германскага ўраду, савет міністраў асыгнаваў на патрэбы турызму 8 млн. аўстрыйскіх шылінгаў (шылінг—27 кап.).

Новыя бясчынствы манчжурскіх улад на ст. Пагранічная

Перарыў простых зносін паміж КУЧ і Усурыйскай чугункай

ХАБАРАЎСК, 2 (БЕЛТА). 31-го мая ўзброены атрад паліцыі на чале з японскім чыноўнікам міністэрства шляхоў зносін МАНЧЖОУ-ГО — САТО перарваў простыя зносіны паміж КУЧ і Усурыйскай чугункай, якія існуюць на працягу многіх год на аснове заключанай паміж дарогамі згоды. Ад начальніка станцыі ПАГРАНІЧНАЯ былі адабраны ключы ад чыгуначных стрэлак. Лініі, якія злучаюць КУЧ з Усурыйскай чугункай, зашыты папярочнымі шпаламі і на галоўнай лініі ўстаноўлен шлагбаум для перашкоды далейшаму руху таварных цягнікоў. Паліцыя ўручыла нач. станцыі пісьмовае распараджэньне ад імя манчжурскага ўраду за подпісам японца САТО, чыноўніка міністэрства Шляхоў Зносін (былога служачага Паўднёва Манчжурскай чугункі), начальніка аддзяленьня чыгуначнай паліцыі ЯН-ШЫ-ЮАНЯ і назіральніка 5-га аддзяленьня белагвардэйца НОВІКАВА, з патрабаваньнем неадкладна перарваць простыя зносіны і рабіць на ст. ПАГРАНІЧНАЯ перагрузку грузаў, якія ідуць на Ўсурыйскую чугунку, матывуючы гэтыя меры фальшывымі прычынамі аховы маемасьці КУЧ.

Начальнік станцыі заявіў пратэст супроць незаконных дзеяньняў манчжурскіх улад, якія парушаюць існуючую згоду і дэзарганізуюць нармальную работу станцыі і вярнуў атрыманае ім пісьмовае паведамленьне, як накіраванае не па адрасе, прапанаваўшы па ўсіх пытаньнях зьмены работы станцыі зварачацца непасрэдна ў кіраўніцтва дарогаю.

Кіраўнік дарогі тав. РУДЫ зрабіў тэрміновы даклад праўленьню, у якім ён паведамляе аб падзеях на ст. ПАГРАНІЧНАЯ, аб гвалтоўных мерах, якія зрываюць дагавор паміж КУЧ і Усурыйскай дарогаю, груба парушаюць камэрцыйныя інтэрэсы дарогі і клієнтаў, і просіць прыняць тэрміновыя меры для забесьпячэньня нармальнай работы дарогі, аднаўленьня работы станцыі Пагранічная, бесперагрузачных простых зносін з Усурыйскай чугункай, якія маюць вялікае міжнароднае значэньне.

Эмбарго на савецкі ўвоз—удар па ангельскай прамысловасьці

ЛЁНДАН, 2 (Белта). Паводле даных «Дэйлі Геральд» на першае чэрвеня 1932 г. копіт савецкіх заказаў, якія выконваліся ў Англіі, складаў 3 млн. 670 тысяч фунтаў; на 1 чэрвеня 1933 г.—700 тыс. фунтаў. У маі 1932 г. новых заказаў дала на 1 млн. 442 тыс. фунтаў, у маі 1933 г.—ні аднаго заказу. У маі 1932 г. савецкія арганізацыі зафрахтавалі 44 судны, што дало ангельскаму параходству 186 тысяч фунтаў, у маі 1933 г. незафрахтавана ні аднаго судна. Вось результаты эмбарго.

Міністры і сэнатары ПАЗШ на хлебох ў Моргана

ВАШЫНГТОН, 2 (Белта). Сэнацкая камісія, якая дасьледуе дзейнасьць банкірскага дому Моргана, установілен рад новых асоб, якія сакратна прымалі ўдзел у вялізарных прыбытках Моргана, у тым ліку кіраўнік амэрыканскай делегацыі ў Жэневе Дэвіс, міністар фінансаў Вудын, сэнатары Макаду і Кін (абодвы—члены сьледчай камісіі), відныя дзеячы рэспубліканскай і дэмакратычнай партыі, судзьдзя вярхоўнага суда, жонка генэральнага агента па рэпарацыях Гільбэрта, былы камандуючы амэрыканскай арміяй у імпэрыялістычную вайну генэрал Пэршынг, былы пасол у Мексыцы Мороў, былыя намесьнікі міністра замежных спраў Поля і Олдс, прыватны фінансавы агент Гувэра Рыкард, шмат другарадных палітычных дзеячоў, сотні прамысловцаў і банкіраў. Рузвэльт прэзідэнцкае патрабаваньням аб адстаўцы міністра фінансаў Вудына, але, як паведамляюць, ён дазволіць Вудыну адыйсьці, калі скандал улягчыцца.

Дэмілітарызаваная зона ў правінцыі Хобэй

ШАНХАЙ, 3 (Белта). Паводле кітайскіх паведамленьняў з Бэйпіну, дэмілітарызаваная паласа, якая устаноўленая згодаю аб перамір'і і ахапляе 17 паветаў правінцыі Хобэй, будзе знаходзіцца пад кіраўніцтвам губэрнатара гэтай правінцыі. Кітайскія войскі ў раёне Бэйпіну, якіх налічваецца каля 300 тысяч чалавек, будуць разьмешчаны ў іншых рабнах, пры чым часьці Жан Сюэ-сяна мяркуецца рэарганізаваць і ўліць у рэгулярную армію Нанкіну.

„Мірная" акупацыя дэмілітарызаванай зоны

ТОКІЁ, 3 (Белта). Паведамляючы аб пашырэньні «суверэнітэту» Манчжоу-Го на раёны на поўдзень ад Вялікай Сьцяны, «Сымбун Рэнго» ўказвае, што насельніцтва Душаньскага павету, які знаходзіцца ў вярхоўях ракі Луань (правінцыя Хобэй), рашыла далучыцца да Манчжоу-Го. Павет пераіменаван у Дзіньлундзкі і ўключан у правінцыю Жэхэ.

Германскія штурмавікі страляюць у польскіх пагранічнікаў

ВАРШАВА, 3 (Белта). «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» паведамляе, што ў апошнія дні германскія самалёты ў тым ліку два ваеннага тыпу 5 раз ляталі над пагранічнай тэрыторыяй Паморскага ваяводзтва. 31 мая ў пагранічным пункце Гурава—Тшонскі, каля Усходняй Прусіі, штурмавікі страляілі па польскіх пагранічніках. З боку германскай граніцы зроблены некалькі ружэйных залпаў у бок пагранічнай польскай вёскі Лесного. Польскія ўлады заявілі германскім пратэст.

Замежная хроніка

* У апошнія дні ў рабочых раёнах Вены праходзілі дэманстрацыі пратэсту супроць забароны кампартыі. Праведзена шмат арыштаў.

* 4 тысячы тэкстыльнікаў Руану (Францыя — дэпартамэнт Луары) рашылі абвясьціць забастоўку пратэсту супроць скарачэньня і без таго нізкай зарплаты на 50 проц.

* Дэкатурскі суд (ПАЗШ) пастанавіў перадаць справу двух самых малалетніх вязьняў Скотсборо Ройрайта і Уільямса ў веданьне суда па справах непаўналетніх, які ня можа выносіць сьмяротных прыгаворы. Амэрыканская сэкцыя МОПР патрабуе вызваленьня Ройрайта і Уільямса, указваючы на незаконнасьць заключэньня іх у турму.

ПАПРАУКА

У перадавым артыкуле «Зьвязды» ад 3 чэрвеня «Неадкладна дапасьці сэўбу»—у першым абзацы закралася памылка.

Замест слоў: «плян выканан толькі на 79,4 проц.» трэба чытаць: «плян выканан толькі на 81,8 проц.».

Лок-Батан—адно з самых вялікіх месцанараджэньняў нафты ў сьвеце

12 сутак з вялізарнай сілай б'е фантан з буравой № 45 на прадмесьці Лок-Батан. 15.000 тон нафты выкідвае фантан у суткі. Па сваіх размерах ён перавышае ўсе нафтавыя фантаны, якія білі ў нашай краіне за апошнія 25 год. Па сваёй магутнасьці ён зьяўляецца чацьвертым у сьвеце.

Што такое Лок-Батан? Чаму да яго зараз прыцягнута ўвага ўсяго сьвету? Ён атрымаў сваю назву ад грязавога вулькану. Геолёгі раней выступалі супроць разьведак у гэтым раёне, бо яны лічылі, што тэрыторыя грязавых вульканаў пазбаўлена нафты. Маладыя геолёгі Азнафты даказалі недарэчнасьць цьверджаньняў старых спэцыялістаў. Геолёгічныя работы выявілі вялізарныя, невядомыя раней багацьці. У 1931 годзе савецкі геолёг тав. Бахіш-Султанаў пачаў разьведкі на Лок-Батане. Першая разьведачная шчыліна дала фантан з сутачным дэбітам у 5.000 тон лёгкай нафты. Забілі фантаны і з іншых шчылін. У сакавіку гэтага году буравая № 18 выкінула на працягу 18 гадзін 10.000 тон. І, нарэшце, фантан з буравой № 45 ставіць Лок-Батан у рады самых вялікіх у сьвеце нафтавых месцанараджэньняў. Ужо зараз выяўлена 9 нафтаносных пластоў, прычым, што асабліва характэрна для Лок-Батану, нафта залягае ня глыбока, на глыбіні 300-500 мэтраў.

Вопыт Лок-Батана сьведчыць аб вялізнічных багацьцях Абшаронскага паўвострава.

За 11 сутак буравая № 45 дала каля 100.000 тон нафты. З гэтай колькасьці адкачана 5 магутнымі помпамі каля 50.000 тон. Дзякуючы герсіоным намаганьням рабочых ударнікаў, чырвонаармейцаў і студэнтаў нафтаінстытуту пабудаваны 7 вялікіх земляных сьвіркаў. У барацьбе за аўладаньне фантанам ударнікі паказалі ўзоры гераізму. У надзвычай цяжкіх умовах яны змагаліся за захаваньне кожнай тоны нафты.

29 мая, пасьля некалькіх дзён барацьбы, ударнікам Лок-Батану ўдалося перамагчы стыхію. Скончана суцэльная абшыўка вусьця шчыліны. На чыгунную задвіжку накінут драўляны калпак, дзякуючы чаму канчаткова ліквідавана распыленьне нафты.

Скончана зварка 4-га трубапроводу з прапускной здольнасьцю ў 6.000 тон у суткі. Гэты нафтапровад злучыў Лок-Батан з магістраллю нафтапровода ду Баку-Батум. Лок-Батанская нафта пайшла ў Батум. Помпы, устаноўленыя ля фантану, перакачваюць звыш 15.000 тон у суткі.

Усебеларускі зьезд савецкіх пісьменьнікаў пераносіцца на восень

У сувязі з тым, што ўсесаюзны зьезд савецкіх пісьменьнікаў—адкладзен, арганкамітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР пастанавіў перанесьці Усебеларускі зьезд пісьменьнікаў, які быў прызначан на 10 чэрвеня,—на восень бягучага году.

Паміж пісьменьнікамі разгортваецца сацыпаборніцтва за набыцьцё права прымаць удзел у работах усебеларускага і ўсесаюзнага зьездаў. Спаборніцтва праходзіць у напрамку абгаварэньня і выданьня лепшых твораў, якія б адлюстроўвалі задачы, пастаўленыя партыяй у другой пяцігодцы, і вялікія перамогі сацыялістычнага будаўніцтва.

На летні час арганізуюцца паездкі пісьменьнікаў актыву на прадпрыемствы, у калгасы, саўгасы, МТС, на сплаў, торфараспрацоўкі, дарожнае будаўніцтва, у чырвонаармейскія лягеры і ў буйнейшыя індустрыяльныя цэнтры Савецкага саюзу. (Белта).

НА СПЛАВЕ

На здымку: Брыгада тав. ВАСІЛЕНКА адна з лепшых сплаўных брыгад Полацкага вучастку

Каштоўная вынаходка праф. Рудзько

Прафэсар Белдзяржінстытуту сьвінагадоўлі т. Рудзько скаструяваў аўтаматызаваны апэрацыйны стол для ўсіх відаў жывёлы. Стол сыстэмы Рудзько дае магчымасьць аднаму чалавеку ўкласьці любую жывёлу і надаць ёй любое становішча на працягу 5-10 хвілін, што мае асаблівае значэньне для ветэрынарных клінік і ветэрынарных лячэбніц.

Улічваючы высокую якасьць паказанай канструкцыі, камісія спэцыялістаў усесаюзнага трэсту «Ветснабпрам» рашыла выпусьціць першую партыю гэтых сталоў ужо ў бягучым годзе.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу апэрацыйныя сталы для жывёлы ўвозіліся ў СССР з-за межаў, галоўным чынам, з Нямеччыны.

Гідралёгічныя досьледы на Дняпры

У чэрвені спэцыяльная камісія гідралёгічнага інстытуту Беларускай Акадэміі Навук пачне падрыхтоўчыя работы, зьвязаныя з вырашэньнем праблемы Вялікага Дняпра. Экспэдыцыя зробіць гідралёгічныя досьледы на плошчы ў 700 кв. кілёмэтраў у маштабе 1 : 100.000 на водападзеле паміж Дняпром і Заходняй Дзьвіной.

Гэтыя досьледы дадуць магчымасьць угрунтаваць пабудову галоўнай трасы канала, які злучыць Дняпр з Дзьвіной і выявіць карысныя выкапні, галоўным чынам, будаўнічыя матэрыялы, патрэбныя для пабудовы плаціны.

Экспэдыцыя будзе працаваць да лістапада, пасьля чаго пачнецца камэральная распрацоўка сабраных матэрыялаў.

ПРАПІСКА ПАШПАРТАЎ

У аддзеле пашпартаў Галоўнага Кіраўніцтва Міліцыі БССР нашаму супрацоўніку паведамілі, што пашпартызацыя насельніцтва Менску будзе закончана не пазьней 10 чэрвеня. Ужо выдана каля 80.000 пашпартаў. Тры агульнагарадзкія пункты скончылі работу. У даны момант працуюць 14 пунктаў.

У сувязі з тым, што выдача пашпартаў набліжаецца да канца, гарсавет прыняў пастанову аб правядзеньні прапіскі насельніцтва. Прапіска пачнецца з 8 чэрвеня і павінна быць скончана на працягу 10 дзён.

Да гэтага часу домакіраўніцтвы абавязаны набыць у аддзяленьнях міліцыі новыя дамавыя кнігі і зрабіць у іх запіс жыхароў, якія атрымалі пашпарты. Для ваеннаслужачых, якія знаходзяцца на абавязковай вайсковай службе ў РСЧА, падставай для прапіскі служыць дакумант, выданы адпаведным камандаваньнем.

Пасьля прапіскі жыхароў у новыя дамавыя кнігі старыя дамавыя кнігі павінны быць захаваны домакіраўніцтвамі да 1 студзеня 1934 году.

Прапіска грамадзян, якія прыяжджаюць з месц, дзе пашпартная сыстэма ня ўведзена, па сваіх асабістых справах (пабачэньне з сваякамі, неабходнасьць лячэньня, вопуск) праводзіцца часова толькі на падставе пасьведчаньняў міліцыі на права жыхарства.

За прапіску пашпартнага дакумэнту спаганяецца збор у суме аднаго рубля.

НАЗНАЧЭНЬНІ

* Тав. Рэвінскі пастаноўай СНК вызвален ад абавязкаў намесьніка наркома земляробства і назначан наркомам юстыцыі БССР і пракурорам рэспублікі. Назначэньне прадстаўлена на зацьвярджэньне ЦВК БССР.

* Прэзыдыум ЦВК БССР назначыў тав. Глезэрава Б. М. намесьнікам народнага камісара юстыцыі БССР, тав. Стрэле Г. У. намесьнікам наркома земляробства, тав. Рудзіна Н. Д. намесьнікам упаўнаважанага наркамсуду БССР.

* Тав. Кудзельскі назначан старшынёю Вярхоўнага Суду БССР.

Напярэдадні ўсесаюзных цяжка-атлетычных спаборніцтваў

11 чэрвеня ў Менск прыяжджаюць лепшыя спартыўныя каманды Саюзу для ўдзелу ў цяжка-атлетычных спаборніцтвах. З РСФСР (Ленінград, Масква, Горкі) прыяжджаюць пры камандзе барцоў, гіраўкоў і баксёраў. Зборныя каманды прыяжджаюць з УССР, ЗСФСР і Сярэдняй Азіі. З-за межаў чакаецца каля 80 спартсмэнаў. З Аўстрыі гіраўкі 1 барцы, з Англіі—баксёры, з Германіі—барцы, з Нарвегіі баксёры і барцы і з Швэйцарыі—гіраўкі.

Менскія калектывы фізкультурнікаў арганізуюць урачыстую сустрэчу камандзе барцоў шэфства над імі. Фізкультурнікі заводу імя Варашылава прымаюць шэфства над камандай Масквы, калектыў заводу «Кампэнар» сустракае каманду з Ленінграда, калектыў фабрыкі імя Кагановіча—каманду з Горкага і г. д.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. 3-ая сэрыя 3-ая амэрыканскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР імя 8-га сакавіка Савецкая № 90. Новы савецкі мастацкі фільм ВЫТРЫЦЕ СЬЛЁЗЫ ў 6 частках. Пачатак сэансаў: Дзенных: 2, 3-30 і 5, Вечэрніх: 7 і 8-30. Каса—з 1 г. дня.

ПРАЛЕТАРЫ. Новы замежны фільм ПРЫСВОЕНАЯ БАЦЬКАМІ драма ў 7 частках

„СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. дня. Мастацкі фільм ГАРАЧАЯ КРОЎ драма ў 6 част.

Беларускі Дзяржаўны зоатэхнічны інстытут сьвінагадоўлі абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на 1-ы курс дзённага і вечэрняга аддзяленьня.

У інстытут прымаюцца асобы, скончыўшыя сярэдняя навучальныя ўстановы пасьля іспытаў.

Заявы прымаюцца да 15-8-33 г.; з 15-8 па 1-9-33 г. іспыты, а з 1-9-33 г. пачатак заняткаў. Студэнты Інстытуту забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй і стыпэндыяй, згодна іх акадэмічнай пасьпяховасьці, спэцыяльнага становішча і сяміу парт. і грамадзкай працы ў разьмерах ад 55 р. да 95 р. у м-ц як мінімум.

Тэрмін навучаньня ў Інстытуце 4 гады. Інстытут надае кваліфікацыю зоатэхніка—сьвінавода з вышэйшай адукацыяй.

Умовы прыёму агульныя, згодна палажэньня Наркамасьветы БССР.

Заявы з дакумэнтамі накіроўваць па адрасу: г. Магілеў, БССР, Камсамольская вул. № 14, Інстытут Сьвінагадоўлі, прыймовай камісіі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Менскі яўрэйскі с.-гаспадарчы тэхнікум, які рыхтуе агранамаў сярэдняй кваліфікацыі, праводзіць АСЕНЬНІ НАБОР на базе 7-годзі на малочна-жывёлагадоўчае аддзяленьне. Колькасьць набору 60 асоб.

Пачатак заняткаў з 1-ХХ-33 г.

Заявы з усімі дакумэнтамі прымаюцца да 15-VIII-33 г.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных і с.-гаспадарчых тэхнікумах.

Адрас: Менск, уроч. Курасоўшчына, чэрвайскі сельска-гаспадарчы тэхнікум тэлеф. 27-369.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" ад 4 чэрвеня. НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ ЖЫЦЬ ... TO LIVE. У гал. ролях: г. Краўчэнка, п. Савалёўскі, в. Кругер. Рэж. С. Цімашэнка. Музыка Г. Папова. Аркестр Ленінгр. дзярж. філармоніі. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ГУКАВАЯ КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО. ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: 6 гадз., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м. КАСА ад 1 гадз. дня.

Ін-туты хэміі і мовазнаўства БАН 5 і 6 чэрвеня 1933 г. склікаюць агульна-гарадзкі сход хэмікаў, навуковых працаўнікоў студэнцтва і настаўніцтва, для абгаварэньня праекту беларускай хэмічнай намэнклятуры і тэрміналёгіі. Даклады: 1) Тав. С. Гімельфарба—(неарганічная намэнклятура). 2) Тав. Л. Шіра—(арганічная намэнклятура). Сход адбудзецца ў канферэнц-зале Беларускай Акадэміі Навук (2 паверх). Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара. Уваход вольны. Дырэкцыя ін-таў мовазнаўства і хэміі.

Даводзіцца да ведама прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый, что з 1-га чэрвеня г. г. ЦЭНТРАЛЬНЫМ САВЕТАМ Т-ВА ВЫНАХОДЦАЎ АДКРЫТЫ НОВЫ БЯГУЧЫ РАХУНАК № 160110326 ў Менскай канторы Дзяржбанку, куды і патрэбна з 1-га чэрвеня пераводзіць усе сумы адлічэньняў 7 проц. ад фонду сацыяльнага выхадзтву і рацыяналізацыі, згодна пастановы ЦВК і СНК СССР ад 13/VIII-31 г. ЦС т-ва вынаходцаў БССР.

Цэнтральны камітэт Т-ва Чырвонага Крыжу (Менск, Першамайская вул., дом № 7) ШУКАЕ наступных грамадзян, якім належыць з Амэрыкі страхоўка, пэнсія і інш. віды ўзнагароды пасьля памершых там іх родных. АДШУКВАЮЦЦА: 1) Цібік Лука. 2) Барон Давід. 3) Альберт Юлій. 4) Рубін Макс. 5) Пасмукскі Ігнат. 6) Генкоўскі (Янкоўскі) (Жэнкоўскі) Пётр. 7) Рохін (Родзін) Дж. 8) Стронген Самуіл. 9) Мічнік Том. Увага: Трэба ведаць, што прозьвішчы в Амэрыкі часта даюцца перабліытанымі пры перакладзе з ангельскай мовы на расійскую.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ „СОЮЗОРГУЧЕТА" з 1-га чэрвеня г. г. арганізуе групу СТАРШЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ ДЛЯ СЫСТЭМЫ БЕЛПЛОДГАРОДНІНА. На курсы прымаюцца бухгальтары і памбухі са стажам работы па двайной бухгальтэрыі не менш 2-х год. Стыпэндыя курсантам устанаўліваецца ад 100 да 150 руб. у месяц, апрача гэтага 25 руб. пазтарных. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца. Пасьля сканчэньня курсанты павінны прапрацаваць на раёне у в шэфпаказанай сыстэме не менш 2-х год. Курсанты прымацоўваюцца да сталоўні. Заявы з дадзенымі дакумэнтаў аб сыстэмаволічы, сацпаходжаньні, аб рабоце бухгальтарам ці памбухам не менш 2-х год, аб узросьце, аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын), аб працоўным стажы і дакладку адміністрацыі ці праўленьня калгасу аб вызваленьні з апошняга месца працы, ці вучобы,—накіраваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-А, 3-я школа. Навучальнаму Камбінату „Союзоргучет". Пры непрадстаўленьні ўсіх пералічаных дакумэнтаў заявы разглядацца ня будуць. Тэрмін падачы заяў да 15-га чэрвеня г. г. Аб дні пачатку вучобы будзе паведамлена кожнаму залічанаму паведамленьнем на дом. Навучальны камбінат „Союзоргучет".

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Лагуноўскі М. Я., Валога К. А., Шчэрбакоў В. І., Даполіцкі І. Б., Шкодэ Г. Д., Мышылевіч З. Х., Станіслаўскі Л. А., Сьліозберг С. Д., Райхлін Х. Н., Вараўко Д. Я., Камлюк П. К., Радзевіч І. А., Вадзёк С. Я., Залескі В. І., Кацман Ф. Э., Палікоў І. А., Варысевіч В. Л., Глазкоў А. А., Васілец В. Г., Вовзія Я. Л., Маслоў К. Ф., Вумбер П. П., Пужавіч М. М., Ігрын А. П., Адамовіч Д. К., Шчэлкун С. Е., Рубін З. М., Шпігун А. П., Богапрымкаў І. А., Маркоўка П. А., Эцін Д. Е., Дворнікаў І. В., Бернштэйн Г. І., Зайцаў П. А., Тулін В. С., Фундылер Х. І., Глембоцкі Н. І., Карпіловіч С. М., Маркін А. В., Чэмэс Я. Я., Крываручка В. С., Гершуновіч

КААПЭРАЦЫЯ МАЗЫРШЧЫНЫ ЖЫВЕ ЎЧАРАЙШЫМ ДНЁМ

МАЗЫР. Ня можа па-сапраўднаму, па-бальшавіцку працаваць тая каапэрацыйная арганізацыя, якая ізалявала сябе ад задач узмацненьня калгасаў, пераўтварэньня калгасьнікаў у заможных. Не апраўдвае сваёй ролі тая каапэрацыя, якая жыве ўчарайшым днём.

Гэта характарызуецца поўнасьцю ад носіцца да спажывецкай сыстэмы Мазыршчыны. Яна не падпарадкавала сваёй работы інтарэсам узьдыму с.-г. вытворчасьці, нічога не зрабіла, каб дапамагчы посьпеху пасеўнай. Яна фармальна, толькі на словах, толькі ва ўрачыстай дэкларацыі ўключылася ва ўсебеларускі конкурс на лепшае сельспажыўтаварыства.

Мазырскі райспажыўсаюз 26 красавіка (заўважце: 26 красавіка — амаль праз два тыдні пасьля абвяшчэньня конкурсу) фармальна вынес пастанову аб уключэньні ў конкурс. На гэтым пастаўлена кропка. Стварылі штаб, які ні разу ня зьбіраўся, апусьцілі ў сельсаветы дырэктывы, як праводзіць конкурс, і супакоіліся. Сельспажыўтаварыствы працуюць па-старому, ня ўвязваючы сваёй работы з задачамі завяршэньня веснавой сяўбы.

Тавары разьмяркоўваюцца па ССТ бясплянава і мэханічна. Больш тавараў атрымлівае тое ССТ, якое раней пасьпее прыехаць на базу і мае больш прошай на свайм рахунку. Такое разьмеркаваньне тавараў ні ў якім разе не стымулюе хутчэйшага скончэньня сяўбы ў паасобных сельсаветах.

Такі-ж малюнак у вясковых крамах. Сельспажыўтаварыствы розьмяркоўваюць тавары ня ў залежнасьці ад выканаўчага пляну. Няма ніякага ўліку перадавых і адсталых калгасаў і насельніцкіх пунктаў. Дый які можа быць улік, калі работнікі каапэрацыі адарваны ад калгаснага жыцьця і зусім ня ведаюць, што робіцца на полі.

Работа крам так пастаўлена, што калгасьнік-ударнік і працоўны адзіласобнік нічога атрымаць ня могуць: крамы, як правіла, адкрыты з 9 гадз. раніцы да 5 гадз. увечары. А гэтыя гадзіны супадаюць з часам самай напружанай работы на палёх.

Райспажыўсаюз, калі яго запытваюць, як ён дапамагае сяўбе, з гонарам указвае: бачыце, у Калінкавічах, Юраўнічах, М.-Аўцюках арганізаваны паліцы ўдарнікаў.

Праўда, паліцы ёсьць, але яны не абслугоўваюць ударнікаў. Ударнікі нічога не атрымліваюць з гэтых паліц, бо ні адно сельспажыўтаварыства ня ведае, хто зьяўляецца ўдарнікам. Яны не вядуць іх уліку. Такім чынам, паліцы арганізаваны фармальна, на паперы.

Райспажыўсаюз Мазыршчыны фармальна падышоў і да заключэньня сацдагавораў з паасобнымі калгасамі, брыгадамі і адзіласобнікамі. Работнікі райсаюзу заяўляюць, што рад ССТ заключылі дагаворы, аднак, колькі заключана дагавораў, як выконваюцца яны—ў раўсаюзе ня ведаюць. Калі праверылі дагаворы, заключаныя ў Калінкавічах і Асташкевічах, дык выявілася, што яны ніадзе не абмяркоўваліся, што яны напісаны без уліку грамадзкасьці. Нават ні адзін з работнікаў райсаюзу, які выяжджаў у нізоўлі, ня можа адказаць, колькі заключана і які іх зьмест. Чаго варты такія дагаворы?!

Грамадзкае харчаваньне ў калгасах і дастаўка абедаў на поле не арганізаваны. Спажывецкія таварыствы не дагаворваліся аб гэтым з калгасамі. Старшыня калінкавіцкага ССТ, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць, заяўляе: «Калгасы адмаўляюцца ад гарачых абедаў». Сьмеху варта такая заява! Каапэрацыя нават ня ставіла на калгасных сходах пытаньня аб дастаўцы гарачых абедаў на поле і ня ведае думкі калгасьнікаў аб гэтым. Безумоўна, калгасьнікі горача падтрымалі гэта мерапрыемства.

Адна з умоў конкурсу—перабудова кіраўніцтва нізоўкай зьверху данізу. Райсаюз кіруе сельспажыўтаварыствамі і крамамі старымі мэтадамі: ён рассылае пудныя, доўгія, нікому непатрэбныя пыркуляры. Бываюць выезды на раён, але яны карысьці ня прыносяць, бо праводзяцца бесплянава, камандыраваныя работнікі ня ведаюць канкрэтна, што яны павінны рабіць на раёне, камандыроўкі часта носяць характар простага гастралёрства.

Мазырскі райспажыўсаюз павінен выкрываць дапушчаныя ім памылкі. Далей так працаваць нельга! Трэба раўпіцца па лепшых спажывецкіх сыстэмах Случчыны і Рагачоўшчыны, якія паказалі ўменьне пераключыцца на выкананьне важнейшых задач, пастаўленых партыяй перад усёй пралетарскай грамадзкасьцю.

Спажывецкая сыстэма Мазыршчыны павінна дапамагчы сваімі спосаб